Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

17 ЛІПЕНЯ 2007 г.
АЎТОРАК

№ 131 (25996)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Беларусь і Кітай выбудавалі добры фундамент адносінаў

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 16 ліпеня ў час сустрэчы з міністрам фінансаў Кітайскай Народнай Рэспублікі Цзінем Жэньцынам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Узаемны давер Беларусі і Кітая на палітычным узроўні з'яўляецца асновай двухбаковага ўзаемадзеяння ў гандлёва-эканамічнай і іншых сферах, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў словы ўдзячнасці ў адрас Кітая і асабіста міністру фінансаў гэтай краіны за дапамогу, якая аказваецца Беларусі. «Наша сённяшняя мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця вельмі падобная на тую мадэль, якая рэалізуецца ў Кітаі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы вельмі ўважліва вывучалі кітайскі вопыт і абавязкова ўлічвалі яго, рэалізуючы некаторыя праекты».

Беларускі лідар падкрэсліў, што Беларусь і Кітай актыўна супрацоўнічаюць у крэдытна-інвестыцыйнай сферы. «Беларусь удзячная за тыя фінансавыя рэсурсы, якія выдзелены Кітаем пад акупныя праекты. Мы гэта ацэньваем вельмі высока і заўсёды будзем удзячныя за гэта», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Гадавы беларуска-кітайскі тавараабарот перасягнуў $1 млрд, што з'яўляецца вынікам актывізацыі двухбаковага ўзаемадзеяння. Беларускі лідар адзначыў, што яшчэ нядаўна стаяла задача павялічыць тавараабарот да $500 млн, аднак сумесныя намаганнямі Беларусі і Кітаю за нядоўгі перыяд удалося перасягнуць гэты паказчык удвая.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь будзе і ў далейшым «прытрымлівацца той палітыкі, дамоўленасць аб якой была дасягнута ў час абмену візітамі». Паводле яго слоў, Беларусь будзе «свята верная гэтым дамоўленасцям».

* * *

Урад Беларусі надае вялікае значэнне наладжванню супрацоўніцтва з кітайскім бокам на ўзроўні не толькі дзяржаўных прадпрыемстваў, але і прыватных структур, заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы з міністрам фінансаў Кітайскай Народнай Рэспублікі Цзінем Жэньцынам. Кітай і Беларусь у 2007—2010 гадах плануюць рэалізаваць больш як 35 гандлёва-эканамічных праектаў. Эфектыўным, на думку Сяргея Сідорскага, з'яўляецца і супрацоўніцтва беларускіх і кітайскіх вучоных, якія цяпер працуюць над рэалізацыяй больш як 200 навуковых праектаў. Падтрымліваюцца і актыўна пашыраюцца культурныя і дзелавыя сувязі паміж краінамі. «Такім чынам, мы прымаем усе меры, каб нашы адносіны адпавядалі духу прынятай Дэкларацыі», — сказаў кіраўнік беларускага ўрада.

Дзяржкампагранвойскаў Беларусі мае намер больш актыўна процідзейнічаць трансгранічнай злачыннасці

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 16 ліпеня прыняў з дакладам старшыню Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў Беларусі Ігара Рачкоўскага, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

У цэнтры ўвагі знаходзілася пытанне, што датычыцца канцэпцыі развіцця пагранічных войскаў Беларусі на 2008—2017 гады і змянення арганізацыйна-штатнай структуры, якая давала б магчымасць больш эфектыўна процідзейнічаць кантрабандзе зброі, наркотыкаў, гандлю людзьмі, нелегальнай міграцыі. Як адзначыў старшыня Дзяржкампагранвойскаў, арганізацыйна-штатныя змяненні абумоўлены, перш за ўсё, усё большым пераходам пагранічных войскаў да выканання праваахоўных функцый.

На сустрэчы абмяркоўваліся таксама пытанні пагранічнага кантролю і работы пунктаў пропуску. Дзяржкампагранвойскаў сумесна з Дзяржаўным мытным камітэтам імкнецца да таго, каб перасячэнне дзяржаўнай граніцы не стварала праблем для законапаслухмяных людзей, але было б непераадольным бар'ерам для злачынцаў. Прэзідэнту даложана аб развіцці прыгранічнай інфраструктуры. Гэта датычыцца, у першую чаргу, паляпшэння работы грузаперавозчыкаў і вызначэння зон іх перамяшчэння і адпачынку ў гарачае надвор'е. Ігар Рачкоўскі праінфармаваў кіраўніка дзяржавы аб міжнародным супрацоўніцтве ведамства, узаемаадносінах з сумежнымі краінамі.

ПАДЛЕТАК ЗНОЙДЗЕНЫ ПРАЗ СЕМ ДЗЁН

8 ліпеня Аляксей Мазураў з Жыткавічаў пайшоў у ягады і заблудзіўся. У тую ж ноч, пасля тэлефоннага званка ў міліцыю яго маці з просьбай аб дапамозе, пачаліся пошукі. Да пошукаў былі прыцягнуты не толькі сілы мясцовага РАУС і аддзела МНС, але і супрацоўнікі лясгаса і грамадскасць. Паводле слоў першага намесніка начальніка Жыткавіцкага РАУС Аляксандра Ахрамовіча, пошукі зацягнуліся з-за немагчымасці дакладна вылічыць напрамак перамяшчэння падлетка. У лясным масіве плошчай прыкладна ў 600 гектараў, з возерам, забалочанымі мясцовасцямі знайсці чалавека даволі складана. Аднак ні на хвіліну пошукі спынены не былі.

Падлетак сам выйшаў з лесу ўвечары 15 ліпеня, недалёка ад вёскі Поўчын. Там яго заўважыў мясцовы жыхар, які, дзякуючы інфармацыі мясцовых СМІ, паведаміў Аляксея і патэлефанаваў у міліцыю. Як высветлілася, увесь гэты тыдзень падлетак еў ягады, піў дажджавую ваду, начаваў пад дрэвамі. Падлетак, на шчасце, здаровы.

Анастасія КАРАЦЕЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На памежжы трох раёнаў

Калі прасачыць шлях вады з лясной крыніцы, што на памежжы трох раёнаў — Глыбоцкага, Міёрскага і Шаркаўшчынскага — дык не толькі адкрываеш геаграфію сваёй краіны — нават Еўропы. Спачатку крыніца збягае ў рэчку Аўту, якая з'яўляецца прытокам Дзісны. Хуткацечная дзісненская вада паглынаецца Заходняй Дзвіною, а тая, як вядома, сілкуе Балтыйскае мора. Далей лёс крыніцы цягнецца да акіянаў — Паўночнага Ледавітага і Атлантычнага. Цяпер ля крыніцы нярэдка мноства людзей, бо вада ў ёй у ліпеньскія дні нібыта набывае гаючую моц.

— Яшчэ 10 гадоў таму вялікіх паломніцтваў сюды не было, — кажа жыхар вёскі Язна, непасрэдны ўдзельнік упарадкавання прыкрынічнага комплексу Антон ВАЙЦЯХОВІЧ. — Але апошнім часам месца становіцца своеасабліваю Мекаю *(на фотаздымку)*. Нават у звычайнай крыніцы свой жыццёвы, не падобны на іншыя, лёс, сваё вымярэнне і прадвызначанасць.

МІНІСТРУ. АСАБІСТА

Працоўнае заканадаўства і выплата заробкаў, пенсіі і дапамогі — няма сумненняў, што гэтыя тэмы хвалююць пераважную большасць з нас. Таму зусім не выпадкова, што па колькасці зваротаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны заўсёды было і застаецца ў сапраўдных лідарах. Толькі за першую палову года сюды было накіравана звыш 2,6 тысячы пісьмаў, а яшчэ больш за паўтысячы чалавек патрапілі на прыём асабіста. Між тым, з чым часцей за ўсё ідуць сёння людзі па адрасу праспект Пераможцаў, 23/2, ад чаго залежыць вырашэнне іх праблем і, у рэшце рэшт, хто і як можа звярнуцца ў міністэрства? Каб знайсці адказы на гэтыя пытанні, карэспандэнт «Звязды» вырашыў паўдзельнічаць у адным з прыёмаў, што праводзіў міністр працы і сацыяльнай абароны Уладзімір Мікалаевіч ПАТУПЧЫК.

ДАГАВОР. І ЎЖО ЗАТЫМ РАБОТА

Час водпускаў, дачных работ і клопатаў па асабістай гаспадарцы. Сярэдзіна лета традыцыйна лічыцца «не сезонам». Тым не менш варта заўважыць адразу — гэта акалічнасць аказалася «аб'ектыўнай» толькі часткова. Ужо з папярэдняга запісу стала зразумела, што жаданне паразмаўляць з міністрам сам-насам выказалі жыхары розных рэгіёнаў Беларусі. А першай сярод іх была магіляўчанка Ганна Карпаўна Фамянкова.

На першы погляд, сітуацыя падалася зусім шараговай. Прадпрыемства, дзе шмат гадоў працавала жанчына, вырашылі ліквідаваць. Ганна Карпаўна напісала заяву на звальненне і, як мае быць, атрымала разлік... Але самае цікавае пачалося потым. Ганну Фамянкову папрасілі папрацаваць яшчэ — у ліквідацыйнай камісіі. І «падмацавалі» сваю просьбу загадам. Паколькі іншых варыянтаў працаўладкавання не было, адказам была згода. І якім жа аказалася здзіўленне, калі пасля амаль пяці месяцаў работы ў камісіі жанчыне па сутнасці проста сказалі «дзякуй». Прынамсі, нават нягледзячы на зварот у гарадскі суд, атрымаць свае заробленыя грошы яна спрабуе вось ужо амаль 3 гады. Прычым безвынікова.

— На жаль, у нечым Ганна Карпаўна патрапіла ў пастку сама, згаджацца на выкананне той ці іншай работы без афармлення дагавора ні ў якім разе нельга. Аднак пазіцыя ўласніка ліквідаванага прадпрыемства, які зноў-такі без дагавора запрасіў да сябе чалавека, — незразумелая таксама, — зазначае Уладзімір Патупчык. — Зрэшты, давайце выходзіць з цяперашніх рэалій. Жанчына звярнулася ў гарадскі суд, дзе атрымала адмову. І зараз нейкім чынам паўплываць на сітуацыю наўрад ці міністэрствам ужо не зможа. Каб абскардзіць першапачатковае рашэнне, трэба звяртацца ў суд больш высокай інстанцыі. Або ў орган нагляду — пракуратуру.

ДАХОД — ЯШЧЭ НЕ ЗАРПЛАТА

Жыхарка Крупшчыны Фаіна Ермалаеўна Новік прыйшла з іншай нагоды — пенсіі мужа. Мікалай Навумавіч Новік пачаў працаваць зменшчыкам на трактары яшчэ ў 13-гадовым узросце, а неўзабаве сеў за трактар сам. Аб тым, якім механізатарам быў муж Фаіны Ермалаеўны, сёння кажуць шматлікія ганаровыя граматы калгаса і райвыканкама, а таксама — узгадка на старонках раённай кнігі «Памяць». Пры гэтым, як кажуць зараз, менавіта высокі прафесіяналізм у свой час аказаўся прычынай прапановы стаць адным з першых арандатараў. Прапанова была прынятая. Але сёння якраз наконт «арэнднага» перыяду і ўзніклі пытанні.

Пасля некалькіх зваротаў у раён, вобласць, міністэрства час работы па дагавору арэнды ўключылі ў стаж, а заробак — прынялі для разліку індывідуальнага каэфіцыента. Праўда, на думку Фаіны Ермалаеўны, не цалкам. Справа ў тым, што пры пераводзе на арэнду гаспадарка выдала крэдыт на суму ў 10 тысяч савецкіх рублёў — «узамен» на абавязацельства здаць усю прадукцыю. Прычым розніцу паміж сумай крэдыту і расходамі на работу муж мог пакідаць сабе на зарплату. І гэтую розніцу, пераканана жанчына, павінны былі таксама ўзяць пад увагу пры вызначэнні памеру пенсіі.

— Частка крэдыту, што засталася ў мужа, з'яўляецца не чыстай зарплатай, а валавым даходам, — лічыць Уладзімір Патупчык. — Апроч працэнтаў, гэтыя грошы ў любым выпадку неабходна было разменкаваць так, каб існавала магчымасць весці пашыраную вытворчасць, інакш кажучы, накіраваць іх на паліва, угнаенні, амартызацыйныя адлічэнні і г.д. Так, пэўная сума з «лішкаў» у тым ліку пайшла і на зарплату. Аднак што гэта за сума — для разліку пенсіі трэба ведаць дакладна. Таму, калі канкрэтна ў гаспадарцы яе не называюць, мы звернемся па дапамогу ў Мінскі аблвыканкам. І будзем спадзявацца, што там дапамогуць разабрацца.

ПАМЕР З УЛІКАМ УСІХ НЮАНСАЎ

Калі рабіць своеасаблівы «рэйтынг папулярнасці», то, безумоўна, на першых месцах у ім будуць «працоўныя» і «пенсійныя» пытанні. Але не толькі. Не менш распаўсюджанай з'яўляецца просьба аб дапамозе. У прыватнасці, пенсіянерам падтрымка можа аказвацца камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, у рэшце рэшт, ёсць варыянт аднаразовай адраснай сацыяльнай дапамогі. Аднак трэба падкрэсліць — гэтыя выплаты прадастаўляюцца аднойчы на працягу года. І, апроч таго, у выпадку складанага матэрыяльнага становішча ці нейкай форс-мажорнай сітуацыі.

Уласна кажучы, такія нагоды ўзніклі ў мінчанак Ніны Цімафееўны Курнушка і Надзеі Рыгораўны Змітровіч. Дапамога ім ужо аказвалася. Аднак сам памер выплат, па 50 тыс. рублёў, пенсіянерак не задаволіў.

— Прычына невысокага памеру можа быць простай — адсутнасць грошай непасрэдна ў момант звароту, — тлумачыць Уладзімір Патупчык. — Тым не менш мы вывучым гэту сітуацыю з улікам усіх нюансаў. І, магчыма, сапраўды прымем рашэнне аб больш важкай падтрымцы.

НЕ «ВЫКЛЮЧЭННЕ», А ЗАКОН

Сам па сабе візіт у міністэрства — яшчэ зусім не гарантыя задавальнення просьбы. «Многія людзі звяртаюцца да міністра як да нейкай вышэйшай інстанцыі, з надзеяй, што ён прыме рашэнне «ў парадку выключэння», — заўважае Уладзімір Патупчык. — Але нельга забывацца, што часцяком прыняць такое рашэнне — значыць, парушыць закон. Тым часам ні міністр, ні хтонебудзь іншы такога права проста не мае».

Разам з тым нельга не адзначыць, што веданне законаў, сваіх правоў і магчымасцяў — гэта і ёсць галоўны шанц пазбегнуць непаразумненняў. Таму калі ўзнікаюць пытанні, лепш за ўсё на самай справе звярнуцца па кансультацыю ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, у абласны камітэт ці ў міністэрства.

Дарэчы, нялішне ведаць, што, апроч міністра і намеснікаў, у міністэрстве наладжаны пастаянны прыём іншымі спецыялістамі. Ён адбываецца з 9 да 18 гадзін у любы працоўны дзень, а таксама з 9 да 13 гадзін па суботах. І да таго ж — без якога-небудзь папярэдняга запісу.

І яшчэ. Каб атрымаць адказ на тое ці іншае пытанне, можна скарыстацца сайтам міністэрства — www.mintrud.gov.by. Пры гэтым у бліжэйшы час зноў-такі праз сайт плануецца наладзіць правядзенне спецыяльных тэматычных канферэнцый. А іх удзельнікам па сутнасці зможа стаць кожны карыстальнік Інтэрнэта.

Сяргей ГРЫБ.

ПЕРШЫЯ «ШТЫКІ»

Учора прызыўная кампанія «Вясна—лета-2007» уступіла ў заключную фазу: у Беларусі пачалася адпраўка маладога папаўнення ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і вайсковыя фарміраванні. У панядзелак на абласных зборных пунктах нашай краіны сабралася каля паўтары тысячы навабранцаў.

У першы дзень адпраўкі маладога папаўнення ў войскі на брыфінг да ваенкамата Заводскага раёна Мінска прыйшоў ветэран Вялікай Айчыннай вайны Міхаіл Міхайлавіч Грыцэнка.

— Скажу некалькі слоў маладым, каб добра служылі.

Расказаць Міхаілу Міхайлавічу сапраўды ёсць што: ён служыў у танкавых войсках, прайшоў вайсковы шлях ад Сталінграда да Берліна, чатыры разы быў паранены.

— У гэты прызыў войскі папоўняць 13 тысяч навабранцаў, — паведаміў генерал-маёр Ігар Глод, начальнік галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба — намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі. — 10 тысяч навабранцаў накіроўваюцца на тэрміновую службу, а 3 тысячы будуць праходзіць службу ў рэзерве. Гэты від службы існуе толькі ў Беларусі. Ён карысны для дзяржавы. Ігар Вячаслававіч заўважыў, што з прыняццем змянення ў Закон «Аб воінскім абавязку і ваеннай службе» павялічваецца колькасць адтэрміновак, бо спектр правоў моладзі прызыўнога ўзросту пашыраецца. Адцягнуць час ваенных будняў, у прыватнасці, змогуць выпускнікі сярэдніх спецыяльных устаноў, аспіранты і дактаранты ўсіх формаў навучання. Самая вялікая колькасць чалавек (27 520) зараз атрымала адтэрміноўку ў сувязі з працягам сваёй адукацыі.

Што ж датычыцца амаратараў «адкасіць», то пакуль цяжка назваць лічбу, колькі прадстаўнікоў «моцнай» паловы чалавецтва зараз адхілілася ад выканання свайго воінскага абавязку (канчаткова гэта стане вядома ў жніўні). Калі ж узгадаць мінулы прызыў, то 1651 чалавек не з'явіўся ў ваенкаматы ці парушыў прызыўныя мерапрыемствы. Супраць 300 з іх узбуджана крымінальная справа. Нагадаю, што крымінальная адказнасць за ўхіленне ад службы ўведзена летась. Ужо асуджана 47 чалавек. Сёлета ўпершыню прызваны выпускнікі ваенных факультэтаў грамадзянскіх ВНУ па спецыяльнасцях малодшых спецыялістаў (прыкладна 200 чалавек па 20 спецыяльнасцях). Яны ідуць у армію на канкрэтныя пасады, тэрмін іх службы складзе 6 месяцаў. Яшчэ адна асаблівасць сёлетняй прызыўной кампаніі — служба ў рэзерве ў Полацку будзе праходзіць у складзе падраздзялення, а не ў вучэбных групах, як гэта звычайна адбываецца.

Ірына ПРЫМАК.

ВЫПРАБАВАННЕ СПЯКОТАЙ ДА +35°...

На гэтым тыдні паветраныя масы трапляюць да нас з боку Заходняй Еўропы, дзе ўжо некалькі дзён гаспадарыць трапічная гарачыня.

Праўда, сёння да нас даляціць крыху астылае паветра, калі максімальная тэмпература ўдзень будзе 24—29, па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — да 35 градусаў, па паўночнаму ўсходу Віцебскай і Магілёўскай абласцей — 26—28 градусаў цяпла.

Аднак ужо ў сераду—чацвер тэрыторыя краіны трапіць пад уплыў павольнага атмасфернага фронту. Тады месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі, пры навальніцах — парывістае ўзмацненне ветру. Тэмпература паветра ўначы — 14—20, удзень у сераду — 25—29, па паўднёваму ўсходу — 30—34 градусаў цяпла; у чацвер удзень — 23—28, у Гомельскай вобласці месцамі да 29—31 градуса цяпла. У пятніцу зноў прыпячэ сонейка, не будзе нават кароткачасовых дажджоў. Тэмпература паветра ўначы 11—17, удзень — ад 22—24 па поўначы, да 30—32 градусаў — па поўдню краіны. Паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, на выхадныя да нас павінны зноў завітаць актыўныя атмасферныя франты. Чакаецца даволі няўстойлівае надвор'е з навальнічнымі дажджамі, шквалістым ветрам. Тэмпература паветра ў суботу будзе вагацца ад 20—23 градусаў па паўночнаму захаду, да 30—34 спякоты ў Гомельскай вобласці. Удзень у нядзелю стане ўжо свяжэй і чакаецца на большасці тэрыторыі ад 19 да 25 градусаў цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА — ЯК «ЛІТАРА ЗАКОНА»

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Тэма новай рэдакцыі «Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» застаецца адной з самых папулярных.

«Звязда» паведамляла ўжо, што на мінулым тыдні ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прайшло пасяджэнне Камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу, дзе абмяркоўвалася падрыхтоўка праекта Закона «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі».

Аб тым, як ішло абмеркаванне, якія пазіцыі новай рэдакцыі Правілаў парламентарыі ўхвалілі, з чым не пагадзіліся, якія выказалі прапановы і заўвагі, мы папрасілі расказаць аднаго з распрацоўшчыкаў дакумента — доктара філалагічных навук, прафесара, загадчыка кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання БДУ, саветніка Міністра адукацыі Віктара ІЎЧАНКАВА.

— «Звязда» працягвае атрымліваць лісты з прапановамі аб удасканаленні правапісу, літаральна днямі атрымалі вялікі ліст ад чытача з Івацэвіцкага раёна...

— Не толькі ў «Звязду», але і ў Міністэрства адукацыі ідуць лісты. Старшыня Камісіі Уладзімір Зданоўіч таксама адзначаў, што ў парламент паступае шмат прапаноў. «Моўнае» пытанне прыцягвае пільную ўвагу грамадскасці. Найбольш актыўнае абмеркаванне новай рэдакцыі Правілаў пачалося пасля 2000 года.

— З чым гэта звязана, на ваш погляд?

— Ужо з'явілася пэўная стабільнасць. Бо калі ўспомніць 1990-я гады — як толькі ні пісалі!.. Новая рэдакцыя правапісу скіравана перш за ўсё на тое, каб захаваць і ўдасканаліць назапашанае папярэднікамі.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Прамая лінія

Новы варыянт Працоўнага кодэкса, кантракты і водпускі, асаблівасці працы жанчын і інвалідаў, рэжым работы і іншыя «прыватныя» пытанні — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **начальніка юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Інэсы Мечыславаўны ЧЫСЦЯКОВАЙ.**

«Прамая лінія» будзе праходзіць **з 11 да 12 гадзін 19 ліпеня па рэдакцыйных тэлефонах (8-017) 292-38-21 і 292-38-92. Адначасова папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287-17-57.**

СП ЗАО «Юнисон»

производитель малотоннажных коммерческих автомобилей марки «Люблин-3» в РБ, предлагает:

- Люблин-3324, грузопассажирский комби (6 мест; 2,4 TD-Евро-3; 5 МКПП TS5-21; г/у JKS, грузоподъем. 840 кг)
- Люблин-0554 шасси, с возможностью установки бортового тентованного кузова, изотермического фургона, специального оборудования (число мест 3; дв. Iveco 2.8 TD-Евро-3; грузоподъем. 1530, объем груз. отсека 10,4 м. куб.)

Республика Беларусь, 223010, п. Обчак, Минский р-н, отдел продажи: 217-52-41, 210-08-59, ф. 210-08-60
e-mail: unison-co@mail.ru

БелСвиссБанк
БЕЛОРУССКО-ШВЕЙЦАРСКИЙ БАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС *на 1 июля 2007 года*

Наименование банка: ЗАО «Белорусско-Швейцарский банк БелСвиссБанк»

(в млн. белорусских руб.)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	01.07.2007	01.07.2006
1	2	3	4	5	6
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101	1	9 680,7	6 062,9
3	Средства в Национальном банке	1102	2	2 950,1	2 386,7
4	Ценные бумаги	1103	3	1 983,1	8 075,5
	для торговли	11031	3.1.	511,0	-
	удерживаемые до погашения	11032	3.2.	-	-
	в наличии для продажи	11033	3.3.	1 472,2	8 075,5
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	18 657,6	12 968,8
6	Кредиты клиентам	1106	5	8 539,2	4 490,1
7	Инвестиционные ценные бумаги	1107	6	15,0	-
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	12 030,2	1 228,7
9	Прочие активы	1109	8	8 790,8	11 797,1
10	ИТОГО активы	110		62 646,7	47 009,8
11	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
12	Средства Национального банка	1202	9	-	-
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	4 923,8	9 387,3
14	Средства клиентов	1206	11	30 409,7	17 801,4
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	208		1 517,8	638,5
16	Прочие обязательства	1209	12	8 675,6	4 830,4
17	ВСЕГО обязательства	120		45 527,0	32 657,6
18	КАПИТАЛ				
19	Уставный фонд	1211	13	14 778,2	14 778,2
20	Эмиссионный доход	1212		-	-
21	Резервный фонд	1213		669,3	600,6
22	Накопленная прибыль	1214	14	290,4	113,0
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	1 381,9	-1 139,6
24	Всего капитал	121		17 119,8	14 352,2
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		62 646,7	47 009,8
26	ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ				
27	Требования			5 829,0	1 100,0
28	Обязательства			2 890,8	1 117,6

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ *на 1 июля 2007 года*

Наименование банка: ЗАО «Белорусско-Швейцарский банк БелСвиссБанк»

(в млн. белорусских руб.)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	01.07.2007	01.07.2006
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		1 208,5	991,0
2	Процентные расходы	2012		312,2	388,7
3	Чистые процентные доходы	201	18	896,3	602,3
4	Комиссионные доходы	2021		1 836,2	1 296,7
5	Комиссионные расходы	2022		167,2	158,6
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	1 669,0	1 138,1
7	Чистый доход от операций с иностранной валютой	203	20	3 933,3	2 736,0
8	Чистый доход от операций с ценными бумагами	204	21	62,1	- 450,7
9	Доход в форме дивидендов	205		-	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	1 003,4	-
11	Прочие доходы	207	23	84,7	14,8
12	Операционные расходы	208	24	4 904,6	2 992,8
13	Прочие расходы	209	25	275,6	721,9
14	Налог на прибыль	210		91,1	221,6
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		370,7	104,2

Председатель Правления **В.А. Казбанов**
Главный бухгалтер **И.И. Трепашко**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 7 от 26.10.2006 г.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВАЙНУ СУПРАЦЬ ІРАНА ЗША МОГУЦЬ ПАЧАЦЬ У БЛІЖЭЙШЫЯ ПАЎГОДА

Баланс сіл у Белым доме з нагоды палітыкі ЗША адносна Ірана схіліўся на карысць пачатку ваенных дзеянняў яшчэ да канца прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Джорджа Буша. Гэта адбылося пасля спецыяльнай нарады ў Пентагоне, паведаміла ўплывовая брытанская газета «Гардыян».

Нягледзячы на тое, што адміністрацыя прэзідэнта Буша падверглася моцнай крытыцы з-за палітыкі ў Іраку, яна мае намер сканцэнтраваць цяпер свае намаганні на Іране. Добра інфармаваная крыніца газеты ў Вашынгтоне паведаміла: «Буш не збіраецца пакідаць сваю пасаду, пакуль сітуацыя ў Іране знаходзіцца ў падвешаным стане».

Белы дом сцвярджае, што Іран, уплыў якога на Блізкім Усходзе значна павялічыўся за апошнія некалькі гадоў, поўны рашучасці пабудаваць ядзерны рэактар для вытворчасці ядзернай зброі і зараз займаецца ўзбраенненем баевікоў у Іраку і Афганістане. Віцэ-прэзідэнт Дзік Чэйні даўно настойваў на ваенных дзеяннях супраць Ірана з-за ўзросшай пагрозы з боку гэтай краіны, аднак увесь гэты час яму процістаялі дзяржсакратар Кандаліза Райс і міністр абароны Роберт Гейтс.

ВЯЛІКІЯ АХВЯРЫ Ў ІРАКУ

У іракскім горадзе Кіркук на поўначы краіны ўчора адбыўся двайны тэракт, які забраў жыцці 90 чалавек, перадае агенцтва Рэйтэр, спасылаючыся на прадстаўнікоў паліцыі. У спісе параненых — 136 чалавек. Паліцыя не выключае, што колькасць ахвяраў тэрактаў можа яшчэ вырасці.

Два замініраваныя аўтамабілі ўзляцелі ў паветра ў цэнтральнай частцы горада. У першым выпадку баявік-смяротнік падарваў грузавік, які быў начынены ўзрыўчаткай, недалёка ад офіса Патрыятычнага саюза Курдыстана, на ажыўленай вуліцы. Вялікі ўрон нанесены таксама суседнім дамам.

Другая машына ўзляцела ў паветра на мясцовым рынку. Выбухі прагрымелі з розніцай у некалькі хвілін. Выбуховай хваляй целы жыхароў раскіданы па ўсёй вуліцы. Загарэліся прыпаркаваныя аўтамабілі, некалькі дзесяткаў чалавек згарэлі жывымі ў аўтобусе, дзверы якога аказаліся заблакаванымі.

Агенцтва ІТАР-ТАСС нагадвае, што апошні найбольш буйны тэракт быў учынены ў Кіркуку больш як год назад. Тады ў выніку выбуху каля будынка гарадскога суда загінулі больш як 20 чалавек і 100 былі параненыя. Абстаноўка ў гэтым горадзе значна абвастрылася з пачатку 2007 года.

Курды дабіваюцца ўключэння Кіркука, які з'яўляецца буйным нафтавым цэнтрам краіны, у адміністрацыйныя граніцы Курдыстана. З такой пазіцыяй не згодныя не толькі суніты, якія знаходзяцца зараз у апазіцыі, але і кіруючыя сёння ў Іраку шыіты. Як лічыць амерыканская разведка, рэгіён знаходзіцца зараз на мяжы грамадзянскай вайны.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.07.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	2 957,42
1 латвійскі лат	4 245,42
1 літоўскі літ	856,46
1 чэшская крона	104,97
1 польскі злоты	788,15
1 расійскі рубель	84,21
1 украінская грыўня	428,94

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	25,4728
10 UAH	50,6065
1000 BYR	11,8506
EUR	35,1066

Курс у гандлёвых кампаніях (на 16.07.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісьмецеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Сяргей СІДОРСКІ:

«ДОЛЖАЎСКАЯ БІЯФАБРЫКА НЕ БУДЗЕ МЕЦЬ АНАЛАГАЎ»

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Сяргей Сідорскі азнаёміўся з ходам рэканструкцыі адзінай у краіне біяфабрыкі, што знаходзіцца ў пасёлку Должа Віцебскага раёна, дзе вырабляюць самыя розныя прэпараты для прафілактыкі захворванняў жывёл і іх лячэння.

Гэта прадпрыемства працуе з 1930 года. Рэканструкцыю задумалі яшчэ ў сярэдзіне 1980-х, але на той час не знайшлося сродкаў. Пакуль што калектыў са 190 чалавек тут вырабляе больш за 35 найменняў вакцын, лячэбных сываратак, растворaў, дыягностыкумаў, іншых прэпаратаў. Толькі сёлета ён папоўніўся 20 новымі супрацоўнікамі. Сярэдні заробак, дзякуючы намаганням дырэктара Аркадзя Юдасіна, за апошнія месяцы павялічыўся на 20 працэнтаў. Фабрыка ў першым паўгоддзі 2007 года спрацавала з 18-працэнтнай рэнтабельнасцю. А калісьці была запазычанасць больш за мільярд...

Цікава, што ў савецкія гады дзейнічалі ў СССР усяго 20 такіх прадпрыемстваў, і толькі адна ў Беларусі.

Дзякуючы ўвядзенню новага 8-павярховага вытворчага корпуса і размяшчэнню ў ім сучаснага абсталявання, што адпавядае самаму «патрабавальнаму» міжнароднаму стандарту GMP, што «расшыфроўваецца» як «правільная вытворчая практыка», фабрыка атрымае новае жыццё.

Сяргей Сідорскі зацікавіўся ў яе кіраўніцтва, што зроблена ўжо падчас рэканструкцыі. Упершыню кіраўнік урада пабываў тут у 2004 годзе. Тады было запланавана інвеставаць у рэканструкцыю гэтага ўнікальнага прадпрыемства першыя значныя дзяржаўныя сродкі. Усяго на рэканструкцыю і набыццё заводскага абсталявання, паводле папярэдніх даных, будзе затрачана больш за 150 мільярдаў рублёў.

Рэканструкцыя ажыццяўляецца паэтапна. На першым паверсе новага збудавання ўжо ўстаноўлены спецыяльныя сістэмы вентыляцыі і шматзруроўневай ачысткі вады, што будзе выкарыстоўвацца для вытворчых мэтаў. Узведзеныя ачышчальныя збудаванні абслугоўваюць і ўвесь пасёлак: вельмі чыстая вада трапляе і ў дамы мясцовых жыхароў. Змацаваралі таксама абсталяванне замежнай вытворчасці для вырабу сываратак.

Сяргей Сідорскі падчас наведвання фабрыкі адзначыў: «Такая маштабная рэканструкцыя — новая для нас справа. І гэта добры прыклад канкрэтнага практычнага супрацоўніцтва айчыннай навукі і вытворчасці. Многія распрацоўкі нашых навукоўцаў раней былі незапатрабаванымі. Цяпер яны могуць быць выкарыстаны. Мы зможам эканоміць па 10 мільярдаў рублёў штогод пры закупцы ветэрынарных прэпаратаў за мяжой. Цалкам гэты вытворчы аб'ект запланавана здаць «пад ключ» у 2009-м.

Тады асартымент вырабленай прадукцыі на фабрыцы павялічыцца мінімум у тры разы, і разоў у 10 павялічыцца валавы аб'ём вытворчасці.

Генеральным падрадчыкам будаўніцтва з'яўляецца віцебскі домабудаўнічы камбінат — той самы, што за рэкордны тэрмін (меней чым за год) пабудаваў дах над Летнім амфітэатрам у Віцебску. А яшчэ тут працуюць каля 20 субпадрадных арганізацый.

Сяргей Сідорскі падтрымаў дырэктара фабрыкі, які актыўна вырашае праблему прыцягнення новых высокакваліфікаваных кадраў, якія патрабуюцца новай сучаснай вытворчасці. У прыватнасці, будуць вырашацца жыллёвыя пытанні. Каб эканоміць энерганосьбіты, дырэктар фабрыкі запланаваў спецыяльную ўстаноўку, што будзе вырабляць адначасова электраэнергію, цяпло, холад і пару нізкага сабекошту. І гэтая ідэя спадабалася прэм'еру.

Напрыканцы свайго візіту на прадпрыемства прэм'ер падкрэсліў, што ўвод фабрыкі на поўную магутнасць з такім сучасным абсталяваннем дазволіць годна канкураваць з лепшымі вытворцамі ветпрэпаратаў: «Яна ў комплексе стане самай сучаснай і па-за канкурэнцыяй у СНД»...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Должа—Віцебск.

Звязда-90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося **23 дні**

«Там — твая Радзіма, твая мова»



Маё сяброўства са старэйшай беларускай газетай пачалося менш за год таму і з таго, што адна са сталых звяздоўскіх падпісчыц удружыла мне кнігу Валянціны Доўнар «Праз каханне». Кніга прыцягвала сваім асаблівым аўтарскім падыходам да жыцця, сваёй мовай, на якой хацелася чытаць нешта яшчэ. «Звязду» я спачатку выпісала сабе дамоў, а потым папрасіла раённае начальства выпісаць і на бібліятэку, бо трэба ж, каб людзі, жыхары Беларусі, чыталі па-беларуску.

Беларускім словам (вёска ў нас рускамоўная) я стала вучыць і дачку. Ёй тры гадкі цяпер і яна ўжо кажа: «сонейка», «ляслінка» (гэта — «раслінка»)...

Чытаю, што пішуць пра газету іншыя людзі і бачу, што «Звязда» сапраўды народная, бо ва ўсе часы яна была са сваім народам, жыла для яго. Пра гэта добра напісала мая калега, загадчыца Антопальскай сельскай бібліятэкі Людміла Лютаровіч.

Згодна я з ёй і ў тым, што пасля публікацый у газеце, на сваё ж, даўно знаёмае, пачынаеш глядзець па-іншаму. У свой час, калі наш Лучын адзначаў 870-годдзе, «Звязда» пісала пра вёску, ад чаго хацелася ганарыцца ёй яшчэ болей...

Многа думак з'явілася і пасля дня падпісчыка, які газета ладзіла ў суседняй вёсцы. Галоўнае — мы, беларусы, вельмі мала ведаем аб сваёй Радзіме, аб сваёй мове. А паправіць становішча проста — чытай «Звязду». Там — твая Радзіма, твая мова.

Несучы яе ў свой народ — як гэта не парадаксальна гучыць — газета робіць вельмі цяжкую, вельмі высакародную справу. У ёй — хочацца дапамагаць. Таму ў бібліятэцы, на маім стале стаіць фірменны звяздоўскі кубачак, ляжыць кніга «Праз каханне» (ужо з аўтографам) і свежы нумар газеты. Усім, хто працуе ў ёй, мне хочацца пажадаць пераканання ў тым, што справа, якую вы робіце, вельмі высакародная і не марная.

Таццяна ЦАРОВА, бібліятэкар Лучынскай сельскай бібліятэкі.

Рагачоўскі раён.

ПЯЦЬ АХВЯРАЎ АДНАГО ДТЗ

За апошнія дні ў краіне адбылося некалькі цяжкіх дарожна-транспартных здарэнняў. Недалёка ад п. Самахвалавічы (Мінскі раён) беспрацоўны жыхар Мінска, 1988 года нараджэння, едучы на аўтамабілі «БМВ», сутыкнуўся з аўтамабілем, якім кіраваў малодшы навуковы супрацоўнік РУП «Інстытут пладаводства НАН Беларусі». Ніхто, на шчасце, не загінуў, але разам з абодвума вадзіцелямі апынуліся ў бальніцы вучаніцы 8-га і 9-га класаў, якія ехалі разам з мінчанінам, і маленькі сын навуковага супрацоўніка.

Яшчэ адно сутыкненне адбылося на паласе сустрэчнага руху каля в. Губіца Шумілінскага раёна. Сутыкнуліся легкавы і грузавы аўтамабілі. Вадзіцель грузавіка, грамадзянін Літвы, змешчаны ў бальніцу, а вадзіцель легкавога аўтамабіля і чатыры яго пасажыры (усе беспрацоўныя) загінулі.

Паблізу в. Вялікая Машчаніца (Бялыніцкі раён) не справіўся з кіраваннем, з'ехаў у кювет і ўрэзаўся ў дрэва беспрацоўны жыхар Маладзечна. Сам вадзіцель зараз у бальніцы, а яго жонка, якая знаходзілася ў водпуску па догляду дзіцяці, а таксама абодва сыны загінулі.

Аляксей ЦІТОЎ, упраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.

БУЯКІ — ЯГАДЫ МАЛАДОСЦІ,

або Што трэба чалавеку, каб быць шчаслівым?

Пад знакамітымі Мілавідамі, на стыку трох раёнаў, раскінулася фермерская гаспадарка «Доктар Шарэц». Паглядзеўшы, як на пяску, дзе і трава не хоча расці, даюць багаты ўраджай буякі, журавіны і брусніцы, падумалася, што завялі мы ў свой час Палессе не ў той бок, куды трэба было.

Усяго ў гаспадарцы 22 гектары пусткі сярод лесу, а пад плантацыямі пакуль што пяць гектараў, але і гэта ўжо нямала, бо многа сіл і часу аддаецца вырошчванню саджанцаў, а яны даюць прыбытак не меншы, чым ягады. А галоўнае, што са збытам праблемы няма.

Найбольшая ўвага тут надаецца буякам, і гэта зразумела. Добра распрацаваная тэхналогія дае магчымасць з аднаго куста буякоў браць у сярэднім па дзесяць кілаграмаў ягады, а ў некаторых выпадках — і да дваццаці. А ягады растуць кучна, як на абляпіхе, хоць памерам з вішню.

Попыт на дзікія ягады агромністы, ад тых жа буякоў Захад «губляе галаву». Лічыцца, што гэтая ягада ўмацоўвае імунную сістэму, стрымлівае працэсы старэння арганізма і з-за гэтага прызвана ягадай маладосці. Ад буякоў няма аскомы. Устаноўлена, што буякі паляпшаюць зрок — здольнасць паскараць праходжанне імпульсу вывы. І з гэтай нагоды буякі абавязкова ўваходзяць у дыету амерыканскіх лётчыкаў. А тое, што буякі не назапашваюць радыенукліды і выводзяць з арганізма цяжкія металы, таксама добра вядома. Вось і думаецца: «А чаму ў нас яшчэ так мала плантацый з ягаднікамі? Чаму на Палессі няма ніводнага сельгаскааператыва, які спецыялізаваўся б на іх?»

— У Беларусі рэанімаваныя толькі чатыры гатункі буякоў, а ў свеце налічваецца больш чым 150 і ў нас маглі б вырошчваць гатункаў 20—25, — разважае Васіль Лісейчыкаў. Ён узначальвае гаспадарку і адказвае за яе стан, бо сам уладальнік, на каго зарэгістравана гаспадарка, — Юрый Шарэц жыве ў Маскве.

Калі з Васілём Васільевічам я сустрэўся на плантацыі, то склалася ўражанне, што дзесьці яго даводзілася бачыць і чуць прозвішча. І пазней, падчас размовы, высветліўся наступны факт. Сапраўды, В. Лісейчыкаў з сям'і, якая 120 гадоў аддала лесу і сам ён 15 гадоў адпрацаваў дырэктарам лясгаса, але неяк здарыўся канфлікт, і былы міністр лясной гаспадаркі звольніў Лісейчыкава з пасады. Суд у хуткім часе аднавіў яго на рабоце, але, папрацаваўшы яшчэ год дырэктар сам падаў заяву і пакінуў лясгас. А тут ягадамі зацікавіўся наш зямляк з Масквы і прапанаваў былому дырэктару ўзяць гаспадарку ў свае рукі.

— У лясгасе ўсіх найперш турбавала, колькі лесу напілаваў, а не вырасціў. А тут жывая справа. У свой час закончыў інстытут па лясной спецыялізацыі і мне тут усё добра вядома, — кажа В. Лісейчыкаў.

Падалося, што ўпраўляючы задаволены лёсам. Ходзіць басанож, у прыўзнятым настроі і размаўляе на добрай беларускай мове...

Некалі тут думалі размясціць гадавальнік лесу, але ў пяску трактар грузнуў, і ад гэтай ідэі адмовіліся, а вось ягады растуць. Ім неабходна кіслая глеба, і буякі спеюць з чэрвеня па лістапад.

На плантацыі сёння расце 28 гатункаў, але прадаваць можна толькі чатыры. Найбольш кустоў амерыканскага «Блюкроп» — гэты гатунак самы ўраджайны. А ёсць яшчэ гатункі з вельмі салодкай ягадай, з самай буйнай, ці нейтральнай па смаку.

Фота Людмілы РЫЖАНКОВАЙ.

— Кепска, што першыя гатункі, якія прыйшлі на Беларусь 25 гадоў таму, сёння ўжо забытыя, — гаворыць мой суразмоўца. — Цяпер галоўнае, каб у ягады быў таварны выгляд, а тыя гатункі больш дробныя, хоць ураджай давалі такі ж і былі саладзейшыя.

Самыя высокія кусты буякоў — метра ў паўтара, а ёсць і нізкія — сантыметраў сорак.

Напачатку расаду набывалі ў Інстытуце лесу, Цэнтральным батанічным садзе Акадэміі навук ды ў калег, якія пачалі разводзіць ягаднікі раней. Сёння канкурэнцыя, бо ягадамі займаюцца фермеры ў Баранавічах, Жабінцы, пад Брэстам, на Віцебшчыне... але пакуль яны не замінаюць адзін аднаму — у кожнага свой рынак збыту.

З гаспадаркі «Доктар Шарэц» расада, у асноўным, ідзе ў Расію. Магазіны Масквы, Пецярбурга, Тулы бяруць саджанцы ягад з задавальненнем. Пастаўляецца расада і на Украіну. А журавіны трапляюць нават у Хабараўскі край. Што датычыцца Беларусі, то ў нас да ягаднікаў ставяцца даволі спакойна. Напэўна таму, што ў нашых лясах ягад хапае. Адзіны горад, у якім ёсць попыт на расаду ягаднікаў, — Салігорск. Там, бывала, на кірмаш з'язджалася да 40 машын толькі з расадай ягад.

Не толькі саджанцы, але і ягады маюць павышаны попыт, але зноў жа за межамі Беларусі. Аднойчы завезлі 500 кілаграмаў у Сочы, дык расхапілі адпачываючыя па надзвычай высокай цане. Праўда, і прадаваліся буякі ў спецыяльных плеценых кошыках.

Дарэчы, ягаднікі — гэта не абавязкова плантацыі. Многія высаджваюць іх каля плота ці замест бардзюраў, а нехта задумаў мець паляначку з брусніцаў ці журавін.

Калі вышэй гаварылася, што журавіны растуць на пяску, то тут ніякай агаворкі няма. Балотная ягада на пяску дае багаты ўраджай — з 7 квадратных метраў да 6 вёдзер ягады. А ўвесь сакрэт у тым, што для журавін трэба падрыхтаваць спецыяльную пляцоўку — глебу неабходна насыпаць на плёнку і тады пад ягаднікам будзе пастаянна вільгаць.

Адносна праблем — яны ёсць, хоць у самім раёне адносіны спрыяльныя. Пытанні найперш узнікаюць на абласным узроўні.

— Прыязджае расіянін і хоча купіць 50 каліў ягад, — кажа Васіль Васільевіч. — Гэта дробязь, але і на іх трэба браць дазвол у Брэсце. А гэта час, турботы, і людзі адмаўляюцца. Зразумела, калі ты вывозіш партыю ў некалькі тысяч саджанцаў. Тут, напэўна, неабходна ўстанавіць верхнюю планку, з якой чалавек абавязаны прад'явіць даведку, напрыклад — 200 саджанцаў. Ёсць цяжкасці і з матэрыяламі.

Плёнку для цяпліц можна купіць і ў нас, але.... Тая плёнка надзвычай трывалая і рулон 33 на 12 метраў каштуе ў Польшчы 180 долараў, а калі нашы пасрэднікі прывозяць, то накручваюць да 400 долараў. У нас усё яшчэ хочуць стаць багатымі адразу ж.

На плантацыі і на ўзвядзенні гаспадарчага будынка працуе сёлета шэсць чалавек — людзі з Ганцавіцкага раёна. Ад паслуг мясцовых давялося адмовіцца. Здаралася, калі збіралі ўраджай, то і камень маглі пакласці, каб цяжэй было, бо аплата па колькасці сабранай ягады.

Сёння Васіль Лісейчыкаў адчувае сябе шчаслівым чалавекам, бо ніхто не перашкаджае працаваць і не стаіць над галавой. Усё залежыць ад вынікаў працы — выратаваных саджанцаў і сабранага ўраджаю.

А яшчэ яму хочацца засадзіць ягаднікамі ўсю тэрыторыю і завесці новы гатунак буякоў з Новай Зеландыі. Там ягады дасягаюць чатырох сантыметраў у дыяметры. Нават не верыцца, бо плод такога памеру і ягадай назваць не выходзіць. Але тым не меней у Еўропе іх ужо вырошчваюць.

На заканчэнне скажу, што ад паездкі на фермерскую гаспадарку «Доктар Шарэц» я атрымаў вялікае задавальненне і вырашыў у самы бліжэйшы час падрыхтаваць на дачы ўчастак і пасадзіць там буякі.

Калі з куста можна сабраць тры вядры ягад, то справа за дробязю — трэба дажыць да такога ўраджаю. Столькі ягад дае куст у 14-гадовым узросце...

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Кватэрнае пытанне

КАЛІ ДОМ ВЕДАМАСНЫ...

Мой сын жыве ў горадзе ў ведамаснай кватэры. Згодна з указам Прэзідэнта, кватэру зараз можна прыватызаваць. А ці можна для гэтай прыватызацыі выкарыстаць мае чэкі «Жыллё», калі я іх падару?

М. ВАЙЦЯХОВІЧ,

Смаргонскі р-н.

Калі ў пісьме размова ідзе сапраўды аб прыватызацыі так званага «ведамаснага» жылля (г.зн. якое знаходзіцца ў гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні дзяржаўнай арганізацыі і займаецца работнікам арганізацыі па дагавору найму жылога памяшкання), то ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам пры яго прыватызацыі жыллёвая квота (чэкі «Жыллё»), якая налічана найменшаму жыльцу жылога памяшкання (і членам яго сям'і), а таксама падорана яму, у прыватнасці, бацькамі, залічваюцца ў кошт пагашэння кошту жылога памяшкання, які вызначаецца ў цэнах на 31 снежня 1991 года. Частка жылога памяшкання, якая не будзе аплачана за кошт жыллёвых квот (чэкаў «Жыллё»», падлягае выкупу ў цэнах, якія дзейнічаюць на дзень падачы заявы аб прыватызацыі жылля.

Пры гэтым неабходна мець на ўвазе, што Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2006 г. № 1 «Аб унясенні змянення і дапаўнення ў Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2005 г. № 6» устаноўлена (падпункт 1.2), што пасля 1 студзеня 2006 г. знаходзяцца ў абарачэнні і выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам толькі перарэгістраваныя чэкі «Жыллё».

Калі ж размова ідзе аб прыватызацыі службовага жылога памяшкання, якая сапраўды дазволена ў асобных выпадках Указам кіраўніка дзяржавы ад 19 сакавіка 2007 г. № 128, то неабходна ўлічваць шэраг асаблівасцяў, якія ўстаноўлены дадзеным указам.

Па-першае, службовыя жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду, якія прадастаўлены ва ўстаноўленым парадку да ўступлення ў сілу Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565 «Аб некаторых мерах па рэгуляванню жыллёвых адносінаў», да 1 студзеня 2008 г. перадаюцца па пісьмовых заявах ва ўласнасць не ўсім, а толькі асобным катэгорыям грамадзян (у прыватнасці, грамадзянам, якія не падлягаюць высяленню са службовых жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду без прадастаўлення ім іншых жылых памяшканняў у выпадках, што прадугледжаны заканадаўчымі актамі) на платнай аснове ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 16 красавіка 1992 года «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь».

Па-другое, указам не прадугледжана бязвыплатная прыватызацыя службовых жылых памяшканняў, г.зн. з выкарыстаннем жыллёвай квоты (чэкаў «Жыллё» таму іх перадача ва ўласнасць можа быць ажыццёўлена толькі на платнай аснове з поўнай аплатай ацэначнага кошту жылога памяшкання.

Неабходна таксама адзначыць, што аплата кошту жылых памяшканняў, якія прыватызуюцца, можа ажыццяўляцца ў растэрміноўку на 40 гадоў пры ўмове ўнясення першапачатковага ўзносу ў памеры не менш чым 10 працэнтаў гэтага кошту.

Віктар САВІЦКІ.

НЕБА ЗАКРЫТА НАДЗЕЙНА

Заходняе аператыўна-тактычнае камандаванне (ЗАТК) ваенна-павятровых сіл і войскаў проціпаветранай абароны было створана ў красавіку 2002 года. Сёння злучэнні і вайсковыя часці ЗАТК размешчаны ў пяці абласцях Беларусі і зона адказнасці войскаў ЗАТК — гэта больш за 1700 км паветранай дзяржаўнай граніцы нашай краіны. А ахоўваць неба Беларусі ёсць каму. Толькі ў склад Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання ўваходзіць 61-я знішчальная авіяцыйная база, 6 зенітна-ракетных брыгад, 2 асобныя батальёны і 4 пункты навядзення авіяцыі.

Штаб камандавання знаходзіцца ў Баранавічах, дзе мы і сустрэліся з **палкоўнікам Дзмітрыем ПАХМЕЛКІНЫМ**, які ўзначальвае войскі ЗАТК.

— Дзмітрый Пятровіч, можна сказаць, што наша неба закрытае надзейна і нейкіх непрыемных сюрпрызаў чакаць не даводзіцца?

— Можна не сумнявацца. Штодня на баявое дзяжурства ў нас заступае прыкладна 250 чалавек і даводзіцца суправаджаць да 260 паветраных суднаў. Большасць з іх — транзітныя і прадстаўляюць дзяржаўныя і прыватныя авіякампаніі розных краін свету. Кожны самалёт, які знаходзіцца ў небе Беларусі, ляціць па адведзеным яму калідоры і ва ўстаноўлены час. Адным словам, большая палова паветранай прасторы Беларусі кантралюецца войскамі Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання.

— Усё гэта так, але тэхніка развіваецца імкліва і многае, што ўчора лічылася перадавым, сёння губляе свае пазіцыі. Як тут складваецца сітуацыя ў падначаленых вам войсках?

— Мы прытрымліваемся распрацаванай праграмай пераўзбраення і праводзім мадэрнізацыю на сваіх заводах. Возьмем, напрыклад, знішчальнік МІГ-29БМ, які пасля мадэрнізацыі ўстанавіў 17 сусветных рэкордаў. Такой тэндэнцыі прытрымліваюцца і ў іншых краінах. На тым жа бамбардзіроўшчыку Б-52 амерыканцы ўжо лятаюць не адно дзесяцігоддзе. Так што ў тэхнічным плане мы не адстаём.

— Помніца, як у савецкія часы дзень і ноч над Баранавічамі раўлі самалёты. Ад іх гулу шыбы ў вокнах дрыжалі. А цяпер вельмі ціха. Што, ёсць праблемы з палівам для вучэбных палётаў?

— Вось сёння ў паветры было 14 самалётаў. А тое, што іх не чуваць, то гэта таму, што палёты праводзяцца ў спецыяльна адведзеных зонах — далей ад горада. І не будзем забываць, што некалі тут базіраваліся бамбардзіроўшчыкі і калі ўзляталі, то шум стаяў... Падкрэслю, што з матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем праблем няма. Самалёты на баявым дзяжурстве і ў любы момант могуць узляцець.

— А што, існуе рэальная пагроза?

— Ёсць ваенная небяспека, а яна можа перарасці ў ваенную пагрозу. І мы не павінны дапусціць такога перарастання. Нясенне баявога дзяжурства — наша галоўная задача, якая выконваецца штодзённа. Дарэчы, у 2004—2006 гадах Заходняе аператыўна-тактычнае камандаванне прызнана лепшым у ВПС і войсках ППА краіны.

— Дзе рыхтуюцца для вашых войскаў спецыялісты, напрыклад, лётчыкі?

— Пілотаў мы ўжо рыхтуем самі. Вучацца ў Ваеннай акадэміі. Да нас прыйдзе сёлета 63 лейтэнанты і з іх — 11 лётчыкаў. Так што з кадрамі праблемы няма. А ў нашай структуры ў асноўным высакакласныя спецыялісты і касцяк іх — афіцэры.

— Як выглядаюць вашы падначаленыя ў параўнанні з калегамі з краін СНД? І ў чымсьці ўступаюць ім ці наадварот?

— Ваеннаслужачыя ЗАКТ прымаюць актыўны ўдзел у ваенных вучэннях Аб'яднанай сістэмы проціпаветранай абароны дзяржаў — удзельнікаў СНД і там мы знаходзімся, як правіла, у лідарах. Цяпер рыхтуемся да аператыўна-тактычных вучэнняў з баявой стральбой на палігоне Ашулук. Пад Астрахань, у Расію мы адпраўляем дзве эскадрыллі...

— Дарэчы, адносіны з расіянамі як складваюцца?

— Нармальныя партнёрскія адносіны. Праводзяцца сумесныя вучэнні — яны прылятаюць сюды, а мы — туды, і расіяне нам зайздросцяць. У нас лепшае забеспячэнне і зарплата вышэйшая...

— Якія існуюць праблемы? Напрыклад, з жыллём для вашых афіцэраў, як складваецца сітуацыя?

— Паступова яны вырашаюцца. Вось у Баранавічах пачалі ўзводзіць для афіцэраў кааператы́ўны дом. А там запланаваны другі...

— Дзмітрый Пятровіч, вы рускі чалавек, былы савецкі афіцэр, то скажыце, а што для вас беларускае войска?

— Настальгіі па мінулым у мяне няма. Неабходна жыць і глядзець наперад. З беларускім войскам я ад пачатку яго станаўлення — з першых дзён стварэння, і гэта маё жыццё. І скажу, што беларускае войска ў параўнанні з савецкім больш мабільнае і якасна падрыхтаванае. І што яно такое ёсць — крыху і маёй заслугі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЧАС ЖАЦЬ. І ЗАРАБЛЯЦЬ

Афіцыйны старт жніва-2007 дадзены на Міншчыне. Сёлета сабраць ураджай у рэгіёне неабходна з агульнай плошчы звыш 610 тыс. гектараў. Прычым, як адзначыў падчас традыцыйнага свята «Зажынкі» старшыня Мінскага аблвыканкама Леанід Крупец, у выпадку добрага надвор'я асноўныя работы ў полі плануецца закончыць у максімальна сцісłыя тэрміны — на працягу трох тыдняў.

Нягледзячы на незвычайную спёку напрыканцы мая—пачатку чэрвеня, а таксама рэзкае панізжэнне тэмпературы і залевы ў першай палове ліпеня сёлетні ўраджай збожжавых плануецца на ўзроўні не ніжэй мінулага года. У цэлым на жніве-2007 у вобласці будуць задзейнічаны звыш 4 тыс. экіпажаў. Пры гэтым, паведаміў намеснік старшыні аблвыканкама Леанід Заяц, гаспадаркі вобласці закупілі 356 новых камбайнаў «Гомсельмаш», і, апроч таго, у бліжэйшы час ёсць намер дадаткова набыць яшчэ 70 адзінак тэхнікі вытворчасці гомельскага завода. Як вынік, у параўнанні з мінулым годам сярэдняя нагрузка на адну машыну прыкметна зменшыцца — да 150 гектараў. А ў сваю чаргу гэта павінна забяспечыць больш высокія тэмпы жніва і звесці да мінімуму страты ўраджаю. Тым больш што напярэдадні актыўных работ удалося падрыхтаваць увесь збожжаўборачны парк, і да таго ж — стварыць неабходныя запасы запчастак і паліва.

Пераможца сярод маладзёжных экіпажаў Ігар АЎДЗЕЙ разам з сынам Мікіткай.

Адначасова, з улікам магчымых дажджоў, сёлета асаблівая ўвага была нададзена зернесушыльнай тэхніцы. Прычым 166 сушыльных комплексаў у вобласці было пераведзена з газу і дызелю на больш танныя мясцовыя віды паліва. Не менш важная адметнасць жніва-2007 — шырокае выкарыстанне гаспадаркамі рэгіёна новай тэхналогіі плюшчэння збожжа. Гэта тэхналогія, зазначыў Леанід Заяц, не проста забяспечыць патрэбу ў кармах, але і ў рэшце рэшт зробіць іх больш таннымі.

На ўрачыстасці прысутнічалі памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, галоўны інспектар па Мінскай вобласці Мікалай ІВАНЧАНКА і старшыня Мінскага аблвыканкама Леанід КРУПЕЦ.

Між тым, нельга не заўважыць, што ўборачная кампанія-2007 на Міншчыне будзе праходзіць у асаблівых умовах. Дажджы і моцны вецер ужо зрабілі сваю справу — зараз у рэгіёне па сутнасці адзначаны сумны «рэкорд» па колькасці палеглага збожжа. Такім чынам, мяркуюць спецыялісты, канчатковыя вынікі жніва шмат у чым будуць залежаць непасрэдна ад прафесіяналізму і майстэрства механізатараў. «У сувязі з гэтым мы вызначылі ўмовы аплаты працы, якія забяспечаць інтарэсы тых, хто ўбірае, возіць і перапрацоўвае збожжа, — падкрэсліў Леанід Заяц. — Таму я перакананы, што сёлетняе жніво пройдзе арганізавана, хутка і што ці не галоўнае — якасна».

Сяргей ГРЫБ, Марына БЕГУНКОВА (фота).

Клецкі раён.

BR15,5 МЛН — ЗА ЖОРСТКАЕ АБЫХОДЖАННЕ З ДЗЕЦЬМІ

Суд Буда-Кашалёўскага раёна прыгаварыў прыёмную маці да буйнога штрафу за жорсткае абыходжанне з дзецьмі.

Як паведамілі ў Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, нейкая Н. Кончыц выконвала апякунскія абавязкі ў адносінах да траіх малалетніх. З красавіка 2003-га па кастрычнік 2006 года яна сістэматычна прыцягвала прыёмных дзяцей да цяжкай фізічнай працы. Рэчы і прадукты харчавання, якія прывозіліся дзецям з Італіі, а таксама пасылкі, што ім перадаваліся, выкарыстоўвала для ўласных патрэб. Жадаючы «адвучыць» дзяўчынку ад курэння, прыпаліла ёй запаленай цыгарэтай твар, ад чаго застаўся шрам. Неабгрунтавана падазраючы дзяўчынку ў крадзяжы прадуктаў харчавання з дому, прымусіла яе выпіць паўлітра алею.

У выніку была ўзбуджана крымінальная справа па арт. 176 Крымінальнага кодэкса (злоўжыванне правамі апекуна або папячыцеля). Як адзначаюць у Генпракуратуры, складанасць была ў тым, што ў следчых не было практыкі і методыкі расследавання гэтай катэгорыі спраў.

Па прыгавору суда Буда-Кашалёўскага раёна Н. Кончыц прызнана вінаватай і ёй прысуджаны штраф у памеры 500 базавых велічынь (Br15,5 млн). Па іску пракурора ў інтарэсах непаўналетніх пацярпелых з яе спагнана матэрыяльная кампенсацыя маральнага ўрону ў суме Br9 млн. Таксама пракуратура ўнесла прадстаўленне ў Буда-Кашалёўскі райвыканкам, па выніках разгляду якога да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнута 6 службовых асобаў райвыканкама. Цяпер дзеці знаходзяцца на выхаванні ў другой прыёмнай сям'і.

Алег ЛІЦКЕВІЧ, БЕЛТА.

Ну і ну

САДЫСТЫ

Размова пойдзе пра жыхарку вёскі Новая Гута Гомельскага раёна і яе сужыцеля. Як можна назваць іх інакш, калі яны (і гэта ўжо ўстаноўлена праваахоўнымі органамі і судова-медыцынскай экспертызай) так «выхоўвалі» чатырохгадовага хлапчука, што адбілі яму пячонку, пераламалі рэбры і нанеслі чэрапна-мазгавую траўму. Малы, вядома, памёр, а садысты арыштаваны.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Крымінал, здарэнні

ЗБІТЫ ПАРУШАЛЬНІК

У Столінскім раёне беларускія памежнікі затрымалі непадалёк ад мяжы з Украінай парушальніка са зламанай рукой і слядамі пабояў.

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-цэнтры Дзяржкамітэта пагранічных войскаў, затрыманы мужчына не меў пры сабе ніякіх дакументаў. Ён патлумачыў вартавым мяжы, што пэўны час знаходзіўся на заробках у Расіі. Там яго моцна збілі і абрабавалі невядомыя злачынцы, якія забралі разам з грашыма і дакументы. На спадарожных машынах «гастарбайтэр» даехаў да Беларусі і спрабаваў нелегальна прабрацца ва Украіну.

Яшчэ адну спробу незаконнага перасячэння беларуска-ўкраінскай мяжы спынілі пінскія пагранічнікі. Яны затрымалі пастуха, які спрабаваў нелегальна перагнаць у суседнюю дзяржаву 10 галоў буйной рагатай жывёлы.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

СУТЫКНУЛІСЯ «СІТРАЕН» І «ГАЗЕЛЬ»

Па факту дарожна-транспартнага здарэння, якое адбылося ў Слуцкім раёне, узбуджана крымінальная справа.

Як паведаміла начальнік аддзялення ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны Ганна Банадык, 12 ліпеня на дарозе паблізу вёскі Васілінкі Слуцкага раёна легкавы аўтамабіль «Сітраен-Ксантыя» выехаў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з машынай хуткай дапамогі. У выніку аварыі загінулі вадзіцель і 2 пасажыры легкавіка. Дасталася і людзям, якія знаходзіліся ў салоне мікрааўтобуса «Газель»: 5 чалавек атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці.

Паводле слоў Ганны Банадык, на месцы ДТЗ працавала аператыўна-следчая група МУС краіны. Зараз разглядаецца некалькі версій аварыі. Паводле адной з іх, трагедыя здарылася з-за таго, што вадзіцель «Сітраена» не ўлічыў дрэнныя ўмовы надвор'я (у той злашчасны дзень ішоў дождж) і няправільна выбраў хуткасць руху. Зусім верагодна таксама, што вадзіцель памянёнага аўто абганяў кагосьці і менавіта вынікам гэтага неабачлівага манеўра стала аварыя.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ВОСЬ ДЫК «ЖОНКІ»

27-гадовага віцебскага беспрацоўнага дома нажом забіла яго грамадзянская жонка. Яна раней была судзімая за крадзеж, таксама нідзе не працавала. Пілі разам спіртное, ды нешта не падзялілі. Пракуратурай Чыгуначнага раёна абласнога цэнтра ўзбуджана крымінальная справа.

У гэтым жа раёне ў той жа дзень таксама нажом дома быў паранены беспрацоўны 1958 года нараджэння. Высветлена, што яго такім чынам пазбавіла здароўя грамадзянская жонка — 45-гадовая беспрацоўная, раней судзімая.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КАМЕНЕМ БУХНУЎСЯ З МОСТА...

Прычына гэтага неабдуманага скачка гамяльчаніна 1978 года нараджэння невядомая, але ісціна ў тым, што перад гэтым ён ужываў алкаголь, і мала хто бачыў яго «палёт» у Сож. З пятнаццаціметровай вышыні. Познім часам, калі на зямлю ўжо ўпалі прыцемкі.

Тым не менш на месца здарэння прыбылі вадалазы з пажарна-выратавальнага атрада МНС і некалькі гадзін абследавалі дно ракі. Беспаспяхова. Труп быў знойдзены раніцай работнікамі гарадской выратавальнай службы на водах. Прадстаўнік

Я і Радзіма

ЧЫНОЎНІК ПРАЦУЕ ДЛЯ НАРОДА, А НЕ НААДВАРОТ

Днямі Генадзь Нявыглас, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, сустрэўся з прадстаўнікамі кіраўніцкай і ідэалагічнай вертыкалі Брэстчыны

— Як адзначаў губернатар вобласці, у цэлым сацыяльна-эканамічная абстаноўка ў Брэсцкім рэгіёне стабільная, — пагадзіўся Генадзь Нявыглас. — Гэта пацвярджаюць і апошнія сацыялагічныя даследаванні, якія праводзіліся сярод жыхароў.

Спакойнай і спрыяльнай палітычную абстаноўку на Брэстчыне назвалі 53,4 працэнта апытаных. Звыш 56 працэнтаў насельніцтва станоўча ацанілі працу мясцовых органаў улады. Аднак нягледзячы на бачныя сацыяльна-эканамічныя поспехі, жыхароў у першую чаргу хвалюе пытанне росту цэн (74 працэнты грамадзян). На другім месцы стаіць такое сацыяльнае зло, як алкагалізм і наркаманія, — 64 працэнты, затым злачыннасць — 42. Выклікае занепакоенасць і той факт, што 40 працэнтаў рэспандэнтаў заклапочаны праблемай выхавання моладзі.

Даныя сацыялагічных даследаванняў паказваюць, што практычна ўсё насельніцтва Брэсцкай вобласці (97%) ведае, што органы ўлады рэалізуюць у сваё дзейнасці заяўленчы прынцып «аднаго акна», аднак толькі кожны другі ўдзельнік апытання выкарыстаў яго (49 працэнтаў).

36 працэнтаў рэспандэнтаў не задавальняе тэрмін выканання заявак, а 63 працэнты пры афармленні дакументаў больш спадзяюцца на свае магчымасці і сувязі, што можна назваць асаблівасцю Брэсцкага рэгіёна, бо ў іншых абласцях такіх вялікіх лічбаў не было. Больш за ўсё апытаных хвалюе адсутнасць мераў па ліквідацыі чэргаў. Паводле меркавання 55 працэнтаў рэспандэнтаў, для атрымання даведкі і іншых дакументаў у парадку жывой чаргі патрэбна затраціць не менш за адну гадзіну. Столькі ж на гэту працэдуру, як сцвярджае каля трэці апытаных, будзе затрачана нават пасля папярэдняга запісу.

Больш за 40 працэнтаў рэспандэнтаў сцвярджае, што ім недастаткова звестак на інфармацыйных стэндах, бо даводзіцца звяртацца па тлумачэнні. Толькі ў кожнага чацвёртага, хто звярнуўся ў «адно акно», няма заўваг да формы і метадаў працы з грамадзянамі.

— У Беларусі ўпершыню ўведзены прынцып «аднаго акна», — звярнуў увагу Генадзь Нявыглас, — для спрашчэння схемы перарэгістрацыі індывідуальных прадпрымальнікаў ва ўнітарныя прадпрыемствы. Папрасіў бы вас там наладзіць працу, каб прадпрымальнікі не казалі, што акно адно, а дзвярэй сем...

У першым паўгоддзі ў Адміністрацыю Прэзідэнта ад жыхароў Брэстчыны паступіла менш зваротаў у параўнанні з аналагічным перыядам летась. Менш за ўсё звярталіся жыхары Жабінкаўскага, Драгічынскага, Ганцавіцкага і Маларыцкага раёнаў.

— Насцярожвае той факт, — кажа Генадзь Нявыглас, — што ў 2006 годзе амаль кожны трэці, а сёлета кожны пяты зварот паўторны. Прыкладна ў палове з іх патрабаванні заяўнікаў былі абгрунтаванымі — значыць, разгляд зваротаў на месцах адбываецца паверхнева, без жадання дапамагчы...

Так, жыхары Столінскага раёна былі вымушаны звярнуцца ў Адміністрацыю Прэзідэнта з просьбай вырашыць пытанне па рамонту дарогі. І нават пасля ўмяшання адміністрацыі мясцовая ўлада прадаставіла няправільную інфармацыю аб заканчэнні работ: толькі праз паўгода просьба была выканана. Адна з пенсіянерак, вязніца фашысцкага канцлагера, праспела дапамогі ў зносе трох вялізных тапаляў, якія пагражалі бяспечнаму пражыванню на яе ўчастку. Мясцовая ўлада знайшла магчымасць спілаваць дрэвы толькі пасля звароту ў Адміністрацыю Прэзідэнта.

— Зараз, калі патрэбна будзе тое ж зрабіць, на іншай вуліцы, таксама пачнуць пісаць лісты Прэзідэнту, — зазначыў Генадзь Мікалаевіч. Атрымліваецца, што мясцовая ўлада не вырашае праблемы, якія знаходзяцца ў яе кампетэнцыі. Як правіла, яны не патрабуюць значных фінансавых затрат. Пакуль я не сустракаў ніводнага пытання, якое б было ў кампетэнцыі Адміністрацыі Прэзідэнта: усё залежала ад распараджэння мясцовых органаў кіравання абласнога ці раённага ўзроўняў.

— Сустракаюцца негатыўныя прыклады, якія інакш не назавеш, як крык душы, — нагадвае Генадзь Нявыглас. — Настаўніца з Пінска ў час цяжарнасці назіралася ва ўрачоў жаночай кансультацыі і абследавалася на апараце УГД. Кожны раз у картцы пісалі, што ўсё ў норме, але жанчына нарадзіла двайнят і абодва дзіцяці з паталогіяй. Настаўніца перакананая, што ў гэтым вінаватыя ўрачы, якія не валодалі прафесійнай падрыхтоўкай. Такія факты не павінны заставацца без увагі кіраўніцтва вобласці!

«Аператыўным метадам веданя настрою і патрэб грамадзян» кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі назваў кнігу заўваг і прапаноў. Цікава, што амаль усе рэспандэнты ведаюць аб яе існаванні, больш як палова верыць, што яна дапаможа, а трэць лічыць, што такі падыход станоўча ўплывае пры прыняцці рашэнняў.

— Аднымі адміністрацыйнымі метадамі дасягнуць высокіх вынікаў праблематычна, — упэўнены Генадзь Мікалаевіч. — Трэба змяніць псіхалогію апарату кіравання і забяспечыць яго адаптацыю ў новых умовах.

Радуе, што 56 працэнтаў жыхароў вобласці адзначае, што стыль і формы метадаў працы сёння змяніліся ў лепшы бок. Аднак не надта высока рэспандэнты ацэньваюць уменне прадстаўнікоў улады паставіць сябе на месца наведвальніка.

Далейшай дэбюракратызацыі, згодна з праведзеным апытаннем, перашкаджаюць недастатковая прававая інфармаванасць грамадзян, слабы кантроль за чыноўнікамі ў выкананні іх дзеянняў, няўменне ці нежаданне дапамагчы насельніцтву. Для ўдасканалення работы адміністрацыйнага апарату грамадзяне прапануюць шэраг метадаў. Сярод іх — стварэнне чыноўнікам такіх умоў, каб яны зразумелі, што вырашэнне праблем наведвальніка ў іх жа інтарэсах, каб чалавек не адчуваў сябе просьбітам, фармальныя, адміністрацыйныя дзеянні патрэбна спрасціць да мінімуму, чыноўнік павінен адчуваць непазбежнасць пакарання за сваю абыякавасць.

— Асаблівую ўвагу Прэзідэнт Беларусі надае ўзмацненню духоўна-маральных і ідэалагічных асноў нашага грамадства, — падкрэсліў Генадзь Нявыглас. — Зараз ні ў кога няма сумнення ў неабходнасці гэтага, хоць мы памятаем і іншыя часы, і як гэта навязвалася. Прыемна, што ў Брэсцкай вобласці праглядваецца наватарства ў арганізацыі ідэалагічнай работы, імкненне вертыкалі ўлады ўносіць у гэту дзейнасць новае, перадавое, пазбягаць штампаў.

Станаўленне ў рэгіёне ідэалагічнай вертыкалі адбылося, — канстатуе Генадзь Мікалаевіч. — Сёння ідэалагічныя работнікі знаходзяць падтрымку прадстаўнікоў улады, значыць і аддача ў рабоце ідэалагічнай вертыкалі павінна быць адэкватнай. Нельга мірыцца з тым фактам, што ў вобласці частка ідэалагічнага актыву не мае вышэйшай адукацыі. Калі мы толькі пачыналі працу, гэта было апраўдана, але сёння іншыя абставіны. Узровень адукацыі нашага насельніцтва расце і ідэалагічны актыў не павінен адставаць.

Ірына ПРЫМАК.

г. Брэст

ВНИМАНИЮ ВЛАДЕЛЬЦЕВ АКЦИЙ ОАО «БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК»

ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» сообщает, что 23 июля 2007 г. состоится внеочередное Общее Собрание акционеров ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» в заочной форме путем письменного опроса с повесткой дня:

- о проведении открытой подписки на акции ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» шестого выпуска;
- об утверждении Краткой информации об условиях открытой подписки на акции ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» шестого выпуска;
- об утверждении Проспекта эмиссии акций шестого выпуска;
- о внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»;
- об утверждении Положения об отделе аудита.

Бюллетени для заочного голосования лица, имеющие право на участие в Общем Собрании акционеров ОАО «Белорусский Индустриальный Банк», могут получить, заполнить и предоставить по месту нахождения головного ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» и его филиалов:

г. Минск, ул. Мельникайте, 8
г. Минск, ул.Энгельса, 30;
г. Витебск, ул. Правды, 8-а;
г. Гомель, ул. Головацкого, 19;
г. Гродно, бульвар Ленинского комсомола, 7-а;
г. Могилев, пер. Комиссариатский, 5-а.

Срок окончания приема заполненных бюллетеней 20 июля 2007 г.

Информация по вопросам повестки дня предоставляется по указанным адресам лицам, имеющим право на участие в собрании, при предъявлении ими документов, подтверждающих личность и полномочия представителя.

Телефон для справок: т/ф 209-41-85.

Наблюдательный Совет ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»

БЫВАЙЦЕ, ДАРУЙЦЕ...

Яшчэ адну страту панесла «Звязда»: гэтымі выхаднымі на могілках у Калодзішчах пахавалі Віталя Канстанцінавіча Васілеўскага, у нядаўнім мінулым — вадзіцеля нашага рэдакцыйнага аўтамабіля. Калісьці казалі: журналіста ногі кормяць. Гэтае выслоўе цалкам справядлівае і сёння, праўда, на дапамогу пішучым і здымаючым рэпарцёрам прыйшоў аўтамабіль. Сотні тысяч кіламетраў за тыя дзесяткі гадоў, што адвёў яму лёс на працу ў «Звяздзе», накалясіў за рулём Віталь Канстанцінавіч па ўсёй краіне. Зноў жа банальнасць, але — чыстая праўда: няма ніводнага раёна ў Беларусі, дзе не пабывала б яго «Волга». Ці то камандзіроўка кагосьці з творчых супрацоўнікаў, ці то дастаўка прыза падпісчыку. І ліпеньская спякота, і снежаньская завея — не перашкода. Галоўнае — рэдакцыйнае заданне. Яно павінна быць выканана пры любым надвор'і. І ў тым, што мы не спазняліся, што паспявалі даносіць патрэбную інфармацыю з самай глыбінкі, ёсць вялікая заслуга і Віталя Канстанцінавіча Васілеўскага. А была ж яшчэ і сям'я — жонка, двое сыноў...

Сёння ўсе мы смуткуем. І спачуваем.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА — ЯК «ЛІТАРА ЗАКОНА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Новая рэдакцыя Правілаў, прапанаваная Саўмінам Нацыянальнаму сходу, абмяркоўвалася надзвычай зацікаўлена. На мінулым тыдні адбылося ўжо другое пасяджэнне камісіі па гэтай тэме. Праўда, зноў ад аднаго скептыка пачуў: ну, што будзе пасля зацвярджэння новай рэдакцыі Правілаў, хіба вы знішчыце Купалу, Коласа?... Калі так ставіцца пытанне — ты нібыта «пакладзены на лапаткі». А ўсё гэта — ад неразумення, што адбудзецца. Як быццам з прыняццем новай рэдакцыі правапісу Купала і Колас застануцца за бортам... Нават калі ўзяць кнігі класікаў пачатку XX ст., калі не было у нескладовага — гэта добра прасочваецца ў факсімільных выданнях... Дык хіба іншымі сталі творы пісьменнікаў пасля 1933 і 1959 гадоў, калі адбылася моўная рэформа і ўдасканаленне правапісу? Зусім не!

Парламентарыі — людзі мудрыя, яны працуюць на электарат, на сваіх выбаршчыкаў. Яны, колькі я зразумеў, аддалі для аналізу настаўнікам праект Правілаў. У выніку дэпутаты звярнулі ўвагу нават на такія дробныя дэталі, якія не былі прапісаны ў праекце — іх мы, канешне, прымем з вялікай удзячнасцю.

— Напрыклад?

— Ва ўласных імёнах сустракаюцца толькі часткі Сен- і Сент (Сент-Экзюперы і г.д.).

Ніякіх пярэчанняў не выклікалі прапановы пісаць выканкАм, прафкАм, райкАм («Звязда» даўно перайшла на гэтыя формы).

Сярод заўваг, якія зрабіў Нацыянальны сход, некаторыя вельмі ўзрадавалі. Парламентарыі не пабаяліся вярнуць тую форму, якую нас прымусілі зняць асобныя міністэрствы і ўстановы: напісанне вялікай літары ў абазначэннях ці найменнях вышэйшай улады. Што маецца на ўвазе? Мы прапаноўвалі (зыходзячы яшчэ з савецкіх традыцый): калі гэта найвышэйшы орган улады — заканадаўчай, выканаўчай, судовай — то яго назву пісаць з вялікай літары: Нацыянальны Сход, Палата Прадстаўнікоў і г.д. Узгадайма, як было: Вярхоўны Савет, Савет Міністраў — з вялікай літары. Мелася на ўвазе, што гэта найвышэйшыя ўладныя органы. Дэпутаты выказаліся менавіта за такую форму напісання, і гэта вельмі добра.

— Нават у нашых суседзяў-расіян: Дзяржаўная Дума (Государственная Дума) — з вялікіх літар.

— Хоць у Канстытуцыі РФ было: Дзяржаўная дума. Але, як і мае быць, практыка стала крытэрыем ісціны.

— Віктар Іванавіч, а вось цікава: чаму некаторыя ведамствы, як вы сказалі, скептычна паставіліся да вялікай літары?

— Кожны баіцца парушыць літару закона. Калі стваралася Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, хтосьці (можа, не надта абдумана) напісаў «Нацыянальны сход» — з малой літары слова «сход»... А мы ж пішам: Нацыянальны Кангрэс ЗША, Усекітайскі Сход і г.д. — словы з вялікай літары там, дзе ідзе назва парламента. Дык чаму ў Беларусі павінна быць іншая практыка? Нелагічна.

...Але дэпутаты пайшлі значна далей. Яны ўвогуле не хочуць рабіць выключэнняў у напісанні вялікай літары, калі гэта абазначэнне кіруючай пасады, назва канкрэтнай установы... Напрыклад: Старшыня Пастаяннай Камісіі Палаты Прадстаўнікоў Па Адукацыі, Культуры, Навуцы І Навукова-Тэхнічнаму Прагрэсу. Альбо: Беларускі Дзяржаўны Педагагічны Універсітэт Імя Максіма Танка... Усе словы — з вялікай літары. Калі пойдзем па гэтым шляху, дык яшчэ больш наблытаем. Увогуле, што лічыць «кіруючай пасадай»? А калі размова пра невялічкую фірму: дырэктар і бухгалтар?... Трэба ісці ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, браць наменклатуру кіруючых пасад?.. Такім чынам, мы рызыкуем завесці сябе ў такую багну, з якой не зможам выйсці.

У нас дзве дзяржаўныя мовы, у школе вывучаецца і беларуская, і руская. І што тады будзе? Па-руску будзем пісаць: Белорусский государственный университет, а па-беларуску: Беларускі Дзяржаўны Універсітэт?.. Не наламаць бы дроў!.. Зусім неабгрунтаванае жаданне нібыта «адвесці ўбок» беларускую мову ад рускай. Нашы мовы — генетычна роднасныя!

— Наша газета досыць падрабязна расказвала аб магчымых моўных зменах. Тым не менш, Віктар Іванавіч, нагадайце, калі ласка, асноўныя прапановы.

— Перш за ўсё гэта датычыцца пашырэння адлюстравання на пісьме закона недысімілятыўнага канця, на якім грунтуецца літаратурная беларуская мова: о застаецца толькі пад націскам, ва ўсіх іншых пазіцыях яно пераходзіць у а. У нас была немалая група слоў-выключэнняў: трыо, адажыо, Ватэрлоо, Токіо... Хіба мы вымаўляем: трыО, адажыО і г.д.? Не, гучыць а. І гэта павінна адлюстравацца пры напісанні.

Адзначу, што некалі Інстытут мовазнаўства НАНБ прапаноўваў зусім іншае, з чым ніяк нельга было пагадзіцца. Прапаноўвалася пісаць -ыё, на манер слова радыё: трыЁ, адыжыЁ, ТокіЁ... Але ж слова радыё — выключэнне, гэта ўплыў дыялектаў. Калі пачала развівацца радыёсувязь, у розных мясцінах называлі па-свойму, нават дзе-нідзе і зараз можна пачуць: радыва... Хіба варта распаўсюджваць гэта выключэнне на зусім іншую групу слоў? Тады атрымаецца, што мы не спрашчаем правапіс, а наадварот, яшчэ больш ускладняем. Вось і быў выбраны аптымальны варыянт.

— Дарэчы, а як прапануецца пісаць слова мовазнаўства?

— Згодна з правіламі 1959 года, часткі складаных слоў мова-, слова-, сто-, што-, некаторыя іншыя з'яўляюцца выключэннямі і не падлягаюць заканамернасці беларускай мовы: калі націск падае на першы склад другой асновы, то ў першай частцы о пераходзіць у а. Мы прапанавалі спрасціць гэтую групу слоў-выключэнняў, пакінуць толькі два выключэнні: слова- (таму што інакш атрымліваецца слава-: словатворчасць, словалюб) і што- (каб не з'явілася штагод).

Парламентарыі ж, наадварот, прапануюць не скарачаць колькасць выключэнняў, а яшчэ больш іх пашырыць, захаваць фота-, мота- і г.д. Але мы прамаўляем: фАтакартка, мАтаролер, а не фОтакартка, мОтаролер...

Мы, распрацоўшчыкі, будзем адстойваць свае пазіцыі ў працэсе далейшай сумеснай работы з парламентарыямі над праектам Закона.

...Яшчэ адзін істотны момант звязаны з напісаннем слоў, якія заканчваюцца на -эр і -эль: ордЭр, камп'ютЭр, лідЭр, шніцЭль і г.д. Мы прапануем замест э пісаць а, што больш адпавядае беларускай гаворцы. І «Звязда» перайшла на напісанне а, і «Настаўніцкая газета», і «ЛіМ» пачынае пераходзіць большменш паслядоўна. А адзін з нашых апанентаў, які лічыць сябе вялікім знаўцам мовы (ён адзін з аўтараў альтэрнатыўнага «Клясічнага правапісу», выдадзенага ў 2005 годзе), крытыкуе: маўляў, не чапайце э!

У даўно запазычаных словах э перайшло ў а: майстар, літаратура. Гэта нестрымальны працэс: тэндэнцыя, якая нарастае. І калі мы дамовіліся, што будзем графічна адлюстроўваць аканне, дык давайце будзем паслядоўнымі і сістэмнымі.

Прапануецца ўвесці ўжыванне у нескладовага ў запазычаных словах: ва ўніверсітэце, ля ўнівермага, на ўніверсіядзе.

Па прапанове прафесара А. Міхневіча ўведзены раздзел «Правапіс некаторых марфем»: не трэба будзе шукаць па часціне мовы, які суфікс (прыстаўка і г.д.) пішацца ў прыметніку, назоўніку. Дастаткова будзе знайсці гэты раздзел — і адразу ёсць адказ на пытанне.

— Чытачы цікавяцца, ці трэба прымаць правапіс законам?

— Некаторыя дэпутаты таксама задавалі такое пытанне. Яно было пастаўлена на галасаванне, прынята рашэнне: быць Закону. Уладзімір Здановіч падкрэсліў: мы будуем незалежную дзяржаву, і мова з'яўляецца найважнейшым складнікам дзяржаўнасці.

Да гэтага правілы правапісу прымаліся пастановамі Саўміна, Саўнаркама. Можна ўзгадаць прыняты маладой савецкай краінай «Декрет о русском правописании» (1917—1918), які адмяніў цвёрды знак на канцы слоў, ліквідаваў некаторыя літары... Калісьці яшчэ Даль гаварыў: калі ў рамане «Вайна і мір» апусціць цвёрды знак, то будзе скарочана каля 30 працэнтаў аб'ёму... Існуе тэорыя эканоміі маўленчых намаганняў.

— Гэтым і тлумачыцца катэгарычнае нежаданне распрацоўшчыкаў вяртаць мяккі знак?

— Безумоўна. Любая літара павінна быць камунікатыўнай. А што нясе мяккі знак, калі будзем пісаць насенЬне, песЬня, сЬнег? Тут ён фармальны. Каму гэта патрэбна?.. Гэта ўжо не камунікатыўная літара, вярнуцца да яе немагчыма. Увогуле, вярнуцца да мовы 1933 года — значыць на стагоддзе адкінуць усё, быццам бы за гэты час у мове нічога не змянілася... Яшчэ ў 1994 годзе ў газеце «Чырвоная змена» я апублікаваў артыкул «Галасаваць за мяккі знак ці адчуваць яго?». Сапраўды, трэба адчуваць правапіс.

...Некаторыя прыводзяць у якасці прыкладу англійскі правапіс: з XIV ст. кардынальных змен не адбываецца. Але ж невыпадкова жартуюць: пішам — Манчэстэр, чытаем — Ліверпуль... Англічане — людзі кансерватыўныя ва ўсім, гэта зразумела. Але галоўнае — у іх прынцып пісьма марфалагічны, а не фанетычны. А ў беларускай мове дамінуе фанетычны прынцып.

У Беларусі, асабліва ў 1990-х гадах, некаторыя выданні пачалі карыстацца «сваім» правапісам. У 2005 г., як я гаварыў, нават выйшаў асобнай кніжкай «Клясічны правапіс». Атрымліваецца нейкі «паралельны» правапіс... З другога боку, наша «трасянка», якая праяўляецца і ў маўленні, і ў пісьме... Гэта ўсё з'яўляецца разбуральным фактарам таго фундаменту, на якім грунтуецца літаратурная беларуская мова.

Калі Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі будуць зацверджаны Законам, то і выдаўцы, і аўтары стануць больш уважліва і паважліва ставіцца да роднай мовы.

У многіх краінах уведзены штрафныя санкцыі за парушэнне маўленчай культуры: у ЗША, Японіі, Польшчы, Францыі...

— У Законе аб друку і іншых СМІ ёсць артыкул 6 «Мова сродкаў масавай інфармацыі», згодна з якім «не дапускаецца скажэнне агульнапрынятых нормаў мовы».

— Але кім «агульнапрынятыя нормы» прынятыя? Калі Правілы будуць зацверджаны Законам, здымаюцца ўсе пытанні.

Можна ўзгадаць словы А. Рубінштэйна: пісанне — гэта задавальненне, а друкаванне — гэта вялікая адказнасць. Асабліва гэта датычыцца сродкаў масавай інфармацыі, афіцыйнай інфармацыі і перапіскі... Мяркуецца, што ўжо восенню будзе слухацца праект Закона аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

— Віктар Іванавіч, былі спробы «абнавіць» і рускую мову, але большасць расійскіх філолагаў выказалася супраць.

— Сапраўды, у Расіі таксама працавалі арфаграфічная камісія, савет рускай мовы пры Прэзідэнце РФ. У 2000 годзе быў вылучаны на разгляд Дзярждумы праект новай рэдакцыі правапісу, падрыхтаваны рабочай групай пад старшынствам прафесара Лапаціна. Але пераважылі больш суб'ектыўныя прычыны... Дазвольце выказаць прагноз: праз гады два ў Расіі абавязкова будзе прыняты новы звод правілаў рускай арфаграфіі.

— 2007 год тым не менш абвешчаны Годам рускай мовы. Ці будзе абвешчаны Год беларускай мовы? Калі ішло абмеркаванне новай рэдакцыі правапісу, дэпутаты не выказвалі такую прапанову?

— Такая думка выношвалася. Было б цудоўна і лагічна, калі б пасля прыняцця Закона «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» быў абвешчаны Год беларускай мовы.

Прыняцце Закона «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» дасць стымул павышэнню культуры маўлення.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Міжнародны скандал

ШПІЁНЫ Ў ПАГОНАХ

Чацвёра беларускіх вайскоўцаў і расійскі афіцэр абвінавачваюцца ў шпіянажы на карысць Польшчы

Беларускія спецслужбы выявілі і абясшкодзілі агентурную сетку польскай выведкі. Пра гэта заявіў у мінулую нядзелю ў эфіры Агульнанацыянальнага тэлебачання (АНТ) намеснік старшыні Камітэта дзяржбяспекі Віктар Вегера.

Паводле звестак КДБ, шпіёны ў пагонах займаліся зборам інфармацыі аб ваенна-стратэгічных аб'ектах Беларусі і Расіі. Іх, у прыватнасці, цікавілі звесткі аб размяшчэнні, колькасці сродкаў проціпаветранай абароны, і найперш комплексаў С-300. Рэзідэнтам польскай выведкі, як лічаць беларускія спецслужбы, быў афіцэр ваенна-паветраных сіл (ВПС) і войскаў проціпаветранай абароны (ППА) нашай краіны Уладзімір Рускін. Па яго ж словах, ён быў завербаваны польскай выведкай падчас спробы незаконнага ўвозу на тэрыторыі суседняй краіны алкагольных напояў, колькасць якіх у 5 разоў перавышала дазволеную норму. Менавіта гэты кампрамат, калі верыць Уладзіміру Рускіну, і прымусіў яго даць згоду на супрацоўніцтва з польскай выведкай.

У рэзідэнта было яшчэ чацвёра памагатых. Трое з іх — беларускія вайскоўцы: начальнік выведкі аднаго з зенітна-ракетных падраздзяленняў і ваеннаслужачыя радыётэхнічнай брыгады, адзін — афіцэр расійскай арміі. Як адзначыў намеснік старшыні КДБ, шпіёны не паспелі нанесці ўрон абароназдольнасці Беларусі і Расіі. Уладзімір Рускін быў затрыманы ў студзені гэтага года пры спробе вывезці за мяжу здымкі ваенных аб'ектаў. Сакрэтныя матэрыялы ён схаваў у аўтамабільным вогнетушыцелі, дзе быў абсталяваны спецыяльны кантэйнер. Неўзабаве былі арыштаваны і астатнія ўдзельнікі групы. Афіцэр расійскай арміі сам прыйшоў у Федэральную службу бяспекі і прызнаўся ў шпіянажы.

Зусім верагодна, што ў хуткім часе шпіёны апынуцца на лаве падсудных. Па інфармацыі КДБ, матэрыялы крымінальнай справы ўжо перададзены ў суд.

Дарэчы, гэта не першы беларуска-польскі шпіёнскі скандал. Некалькі гадоў таму ў Мінску супрацоўнікамі Камітэта дзяржаўнай бяспекі быў затрыманы ваенны і ваеннапаветраны аташэ Пасольства Польшчы ў Беларусі палкоўнік Казімеж Віташчык. Беларускія контрразведчыкі ўзялі дыпламата ў момант атрымання ім матэрыялаў, якія складаюць дзяржаўную тайну нашай краіны.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

САМАЛІЙЦЫ ТРАПІЛІ Ў ІЗАЛЯТАР

Іх было чацвёра, хто ў Гомельскім раёне, паблізу пункта пропуску Новая Гута, спрабаваў перайсці мяжу і апынуцца ва Украіне, каб потым трапіць у Заходнюю Еўропу. Нашы ж пагранічнікі, як гаворыцца, вуха трымалі востра, былі на вышыні...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Утерянный **страховой полис ББ № 0054867** ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» **считать недействительным.**

Замежны спецыяліст будзе трэніраваць беларускіх футбалістаў

Беларуская федэрацыя футбола шукае новага галоўнага трэнера для нацыянальнай мужчынскай зборнай сярод замежных высококваліфікаваных спецыялістаў. Вопыт працы з рускамоўнымі ігракамі вітаецца.

У Брэсце, на пасяджэнні выканкама асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» (яно было зачыненым) было названа пакуль толькі імя новага настаўніка нацыянальнай жаночай зборнай Беларусі: месца Алега Волаха заняў Уладзімір Касакоўскі. Прыярытэтным накірункам у сваёй трэнерскай дзейнасці ён вызначыў стварэнне сістэмы ўзаемадзеяння з юніёрскімі камандамі, каб клапаціцца аб рэзерве і нарэшце пабудаваць інстытут зборных. Пасада ж галоўнага настаўніка ў мужчынскай камандзе пакуль застаецца вакантнай: выканкам БФФ пагадзіўся з заявай Юрыя Пунтуса (ён вярнуўся ў мінскі МТЗ-РІПА) аб яго адстаўцы і зараз актыўна займаецца пошукам новага галоўнага камандуючага.

Федэрацыя футбола пайшла па шляху калег з федэрацыі хакея з шайбай: нацыянальную лядовую зборную каторы ўжо год узначальвае замежны настаўнік, вось і галоўнага трэнера футбольнай каманды шукаюць не сярод беларускіх спецыялістаў і нават не ў краінах СНД. Зірнулі далей.

— Нацыянальная зборная — вяршыня футбольнага айсберга. Зразумела, у такой сур'ёзнай справе, як падбор галоўнага трэнера для яе, не варта падганяць сябе, — перакананы Генадзь Нявыглас, старшыня беларускай федэрацыі футбола. — Сярод крытэрыяў адбору — прафесійныя якасці, валоданне сучаснай методыкай падрыхтоўкі ігракоў. Я перакананы, што замежны спецыяліст шмат карысці прынясе нашай зборнай і зможа вывесці яе на новы высокі ўзровень, бо ў яго свежы позірк на футбол. Кантракт плануем заключыць на 2,5 года, — паведамляе Генадзь Мікалаевіч, — каб трэнер мог сфарміраваць каманду.

І хоць часавых рамак у пошуку новага трэнера няма, зразумела, што на адборачную сустрэчу Еўра-2008 з румынамі (8 верасня) наша зборная не застанецца без важака. Што ж датычыцца бліжэйшага таварыскага матча беларусаў з ізраільцянамі (22 жніўня), то ў выпадку адсутнасці галоўнага трэнера «нацыяналку» выведзе на поле выконваючы яго абавязкі.

Ірына ПРЫМАК.

Бяспека руху

РЭЙД НА «ДАРОЗЕ СМЕРЦІ»

Карэспандэнт «Звязды» прыняла ўдзел у лоўлі «ліхачоў»

Супрацоўнікі Дзяржаўнай аўтаінспекцыі Мінскай вобласці правялі чарговы рэйд па хуткаснаму кантролю на адной з найбольш аварыйна-небяспечных дарог «Мінск—Мікашэвічы». Дарога, на якой у гэты дзень працаваў нарад ДАІ, выбрана невыпадкова. На ёй прыкладна адзін раз у два дні адбываецца дарожна-транспартнае здарэнне. Таму ў трасы «Мінск—Мікашэвічы» з'явілася другая назва — «дарога смерці». У апошні час на кавалках трасы праводзяцца рамонтныя работы, дзе абгон забаронены, шмат на ёй звужэнняў. Вадзіцелі не заўсёды цвяроза ацэньваюць становішча, таму і выбіраюць «не тую» хуткасць руху. Сітуацыя ўскладняецца і неспрыяльным надвор'ем. Менавіта гэтыя фактары выклікалі жудасную аварыю на 99-м кіламетры дарогі «Мінск—Мікашэвічы», у якой сутыкнуліся легкавы аўтамабіль і машына хуткай дапамогі. У выніку тры чалавекі загінулі, пяць былі дастаўлены ў бальніцу з пашкоджаннямі розных ступеняў цяжкасці. Зрэшты кіраўніцтва Дзяржаўтаінспекцыі наўпрост не звязвае правядзенне рэйду з апошняй аварыяй.

— Такія рэйды для нас — справа звычайная, — расказвае начальнік упраўлення ДАІ Мінскай вобласці Сяргей Маслоўскі. — Зараз мы адпрацоўваем навейшую форму выяўлення парушальнікаў, па варыянту змешанага кантролю: адзін аўтамабіль з цывільнымі нумарамі рухаецца з прыборам відэафіксацыі хуткасці, а другі, патрульны, едзе за ім на невялікай адлегласці. Толькі сёння за пяць гадзін мы затрымалі каля дваццаці парушальнікаў, якія перавысілі хуткасць больш чым на 20 кіламетраў.

— Затрыманыя вадзіцелі свае парушэнні тлумачаць тым, што вельмі спяшаюцца, — каментуе рэйд інспектар спецыяльнага падраздзялення ДАІ Мінскай вобласці Ілья Кутановіч. — Мы спрабуем растлумачыць, што не заўсёды бывае так: чым хутчэй паедзеш, тым хутчэй прыедзеш.

Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.

ДЗЕ НАЙЛЕПШЫЯ СПАРТСМЕНЫ? У «БЕЛАРУСБАНКУ»!

Самыя актыўныя і азартныя, лоўкія і ўмелыя супрацоўнікі мінскіх аддзяленняў «Беларусбанка» правялі мінулы ўік-энд у гарналыжным комплексе «Лагойск», дзе, «нягледзячы на дождж, панавала весялосць. Тут, у маляўнічым месцы, проста на палогім схіле разбілі велізарны палатачны лагер амаль 600 удзельнікаў турслёту. У прыязнай сяброўскай атмасферы спаборнічалі 10 каманд — прадстаўніц 9-ці сталічных філіялаў і галаўнога аддзялення. Падобныя мерапрыемствы праходзяць і ў абласцях, з тым, каб лепшыя з лепшых сустрэліся ў канцы ліпеня на рэспубліканскім турслёце. Сёлетні збор праводзіцца ў 9- ы раз (калі не лічыць зімовых сустрэч) і прымеркаваны ён да 85-гадовага юбілею банка.

— Турслёты сталі для нашых супрацоўнікаў прыгожай, добрай традыцыяй, — зазначае **Наталля ПЕТРАЧКОВА, старшыня аб'яднанай прафсаюзнай арганізацыі банка.** — З нядаўняга часу яе падтрымліваюць і іншыя банкі (у тым ліку з Расіі), і кіраўнікі прадпрыемстваў — нашы кліенты. Тут мацнее карпаратыўнае сяброўства і паляпшаецца ўзаемаразуменне паміж удзельнікамі, раскрываюцца здольнасці і таленты нашых супрацоўнікаў, і становіцца зразумела, наколькі яны рознабаковыя.

Як высветлілася, карпаратыўная палітыка банка ставіць сваёю мэтаю зблізіць не толькі супрацоўнікаў, але і іх сем'і.

— Прыезд з дзецьмі толькі захвочваецца, — кажа **Аляксандр БАБІЦКІ, намеснік дырэктара дэпартамента па персаналу «Беларусбанка».** — Акрамя ўдзелу ў турслёце, для дзетак нашых супрацоўнікаў ладзяцца асобныя святы — прыемныя сюрпрызы і падарункі на Новы год і тым, хто «першы раз у першы клас».

З кожным турслётам усё больш вынаходлівымі становяцца не толькі ўдзельнікі, але і арганізатары. Сёлета ў праграме спаборніцтваў з'явіўся абсалютна новы конкурс — «Рыцар турслёту».

— Вясною прайшоў конкурс «Міс «Беларусбанк», — адзначае Аляксандр Леанідавіч, — гэты вопыт ужо не новы для нас, відаць, прыспеў час рыхтавацца і да «містэра». Першым крокам на шляху да будучага конкурсу стаў своеасаблівы рыцарскі турнір на турслёце.

Банкаўскія «рыцары» ўражвалі журы эрудыцыяй, спевамі, танцамі, пачуццём гумару і ... выносліваcцю! Адным з самых нялёгкіх заданняў аказалася як мага даўжэй ўтрымліваць на руках дзяўчыну. Лепш за іншых кандыдатаў з усім справіўся малады супрацоўнік 524- га філіяла Максім Тарашкевіч, ён і стаў першым рыцарам «Беларусбанка».

Пасля ацэньвалі афармленне турыстычных лагераў і выкананне бардаўскіх песень. Здагадваюся, як складана было выбраць найлепшы лагер: што ні куток, то тварэнне мастацтва. Многія з іх былі стылізаваны. 511-ы філіял, які супрацоўнічае з унутраным

Хто каго?

ДВА АРТЫСТЫ Ў ПОЛІ ЧЫСТЫМ

...Мусіць, праўду кажуць, каб нешта ацаніць, прычым па-сапраўднаму, трэба... страціць. Альбо — хоць б спалохацца... «Што ж гэта адбываецца? — першым забіў трывогу сп. Вінаградаў з Бабруйска. — Няўжо газета не знойдзе больш месца для вясёлых здымкаў, няўжо мы не будзем складаць да іх подпісы і выбіраць потым лепшыя?»

За пісьмамі — пайшлі званкі...

Карацей, у гандлі кажуць, што рацыю заўжды мае пакупнік, у службе быту — кліент, у рэдакцыі «Звязды» — што падпісчык. А значыць, яму і слова?

Упрыгожваюць газету
Клешчукоўскія сюжэты!..
Хоць цяпер, на чытачоў,
Напусціў ён штось казлоў?
Але ж нам — казёл, каза...
Знойдуць людзі, што сказаць, —

абяцаюць муж і жонка Астроўскія з Мінска.

Нехта б, мо, ім не паверыў, а мы — адразу, бо што-што, а творчы патэнцыял сваіх чытачоў добра ведаем. Да таго ж і тэма для многіх блізкая:

Тут штрышок вясковай прозы
З пострэформенных падзей,
Бо ў статках цяпер — козы,
А кароўкі — усё радзей, —

канстатуе, ды што там — бядуе, напрыклад, Мікалай Уласавіч Гарбачоў з Сенненшчыны. Прычым, як вясковец і сапраўдны «казавод», — не толькі па тым, што, так бы мовіць, на паверхні ляжыць, але і па схаваным:

Хутчэй пекла тут — не рай:
Паша — голачкі збірай...
Так што козлік — не задзіра,
Няма ў чым яго вініць, —
Хлопца просіць (брыгадзіра)
На штось лепшае змяніць.

Своеасабліва, зазначым, «просіць» — ды вайной жа ідзе! Таму, Юрый Вінаградаў з Бабруйска і баіцца, што такое процістаянне — дабром не скончыцца. Тады чым? Чытайце:

Адзін — неўступака
Другі — задзірака?
То зламаны будзе рог,
Ці ссінее ...

Самі ведаеце, што.

Але ж — бяда вялікая — яго (ну месца таго) не вельмі і шкада: ссінее і ссінее — хто яго бачыць...

Куды горш будзе, калі да «брыгадзіра» не дойдуць парады сп. Чыгрынавай з Вілейшчыны:

Калі розум не казліны,
Не дражні яго, хлапчына,
Бо ў такое смальне месца, —
Адцураецца нявеста.
Во якое гора будзе...

А зрэшты — такога цяпер толькі маладыя жанікі забаяцца могуць. Больш сталыя — помняць яшчэ старую песню аб галоўным з яе трапным: «Если к другому уходит невеста, то неизвестно, кому повезло». У сэнсе — таму **да** каго, ці каму **ад**... Бо ён (апошні), як мінімум, свабодным застаўся, а значыць да пары — можа каго іншага шукаць. І, што адметна — не толькі сярод прадстаўніц процілеглага полу: мода цяпер ці што, каб хлопцам — сярод хлапцоў, дзеўкам — сярод дзевак...

Гэтую ж думку працягвае ўжо знаёмы нам бабруйчанін Вінаградаў. Піша:

Радасна, што ў нас жывёл
Вельмі любяць людзі...
Па душы хлапцу казёл?
Хай ім добра будзе!

Ну насамрэч! Хай! Паглядзіце, як ім весела, як яны вытанцоўваюць!

Сп. Дубовік з в. Арэшкавічы, што на Бярэзіншчыне, нават ведае, што:

Два казлы не без імпэту
Польку таньчылі дуэтам.
Пора ж, праўда, хоць куды?
Сталі — зоркамі «Звязды».

«За казла адкажаш!», — можа (свят-свят-свят!) усклікнуць адзін з герояў? Загадзя павінімся — не па злосці так нашы чытачы, а з любасці. Інакш, ну згадзіцеся, не было б ні гэтага здымка, ні большасці подпісаў, у адным з якіх, дарэчы, вельмі падрабязна ўсё распісана:

У газеты — шлях цярністы,
Век служыла для людзей...
Два артысты
ў полі чыстым?
Каб нам стала весялей!

Так, па палічках, разлажыла ўсё сп. Тарасік з Мінска.

Але ж па меркаванню іншых, у кадр гэты ўвайшло не ўсё. Недзе побач павінны быць яшчэ дзеці, жонкі галоўных герояў, бо яны тут — не проста дражняцца:

Адзін — сямейку забаўляе
Другі — сваю абараняе...
Іх па галоўках не пагладзяць,
Калі ўсё кінуць і паладзяць, —

мяркуе сп. Томкавіч з Вілейкі.

Значыць, перамір'е ім нельга заключаць. Тым больш, што тут — новыя перспектывы адкрываюцца. «Дзесці там, — піша сп. Звягінцаў з Кіраўска, — у суседняй краіне «Танцы з зоркамі», «Зорны цырк»... Найшлі, чым здзівіць. Тут, на нашай зямлі, зусім іншае:

Узяў на грудзі самагонкі
І навошта тыя зоркі?
Шоу будзе ў самы раз:
«Танцы з козамі» ў нас!

Танцы — згодны з ім: няхай сабе будуць, — што б такое зрабіць, каб самагонкі не было, во ў чым пытанне!

І хваляваць яно павінна ўсіх, лічыць сп. Гарбачоў з Сенненшчыны. Больш за тое (ды казе ж зразумела!), кожны павінен хоць нешта рабіць, каб ліха гэтае звесці. Яна — і робіць... Што можа:

Да казлоў ужо даходзіць,
Што спявацца народ —
Перакрылі ўсе дарогі
На падпольны спіртзавод.

А калі б не? Калі б людзі, крый Бог, свабодна гналі, куплялі, пілі? Ці трэба казаць, што б было? Хіба — радкамі сужэнцаў Астроўскіх:

Ой, як цяжка пане-браце,
Калі два «казлы» ў хаце
І адзін другому — катам...
Гора, гора «казлянятам».

Як звесці яго, на гэты раз чытачы не пішуць, а вось, як не «завезці»?

Ну зразумела ж: берагчы трэба кожнаму свой дом — ад гарэлкі, ад іншага ліха. Берагчы ўсімі магчымымі сродкамі. Алена Пажога з Глыбоччыны, напрыклад, піша, што вось гэта жывёліна — зусім новай пароды. Яе на вартаўніка людзі вывучылі. І цяпер ён мала таго, што ніякага п'янтоса на падворак не пусціць, ён яшчэ нікога і... не выпусціць. З дрэннымі намерамі:

Не сысці, не адлучыцца, —
Каля хаты — вартаўнік.
З такім — добра жонцы спіцца:
Не збяжыць нідзе мужык.

І ў самой, значыцца, лішніх спакусаў не будзе — панесціся недзе, у блуд пайсці.

Не гаварылі б мы пра яго, ды што зробіш — папулярным стаў: на здымку многія з чытачоў за рогі «зачапіліся». На думку Уладзіміра Ільіча Барысёнка з в. Старое Сяло Ушацкага раёна, ёсць яны ў абоіх герояў. І таму —

Каб ад гора не завыць,
Здрады ўсе забыцца,
Нам, рагатым, што рабіць?
Толькі весяліца!

Але ж і тут трэба меру ведаць, пільнасць не губляць, бо захопішся, а там... Нехта чужы... У твой агарод. Нават не проста намерваецца, а ідзе ўжо! І аж з сябе выходзіць, «тлумачыць» на хаду (словамі Валерыя Гаўрыша з Пастаўшчыны):

Колькі можна гаварыць,
Дурань ты рагаты,
Доктар я! Мне коз лячыць...
Не асемянатар!

Але ж па цяперашнім часе ды беднай жывёліне паспрабуй, разбярыся , хто ёсць хто? Яна ж ў нас

Ці не таму рагатая,
Злосная, калматая,
Зяцята наравістая,
Што трэба жыць...
І выстаяць!

...Вось гэтага — і жыць, і выстаяць! — не лішне пажадаць кожнаму чытачу, кожнаму ўдзельніку вясёлай звяздоўскай гульні (як і самой газеце). Не ўсіх (прабачце!) мы сёння назвалі, не ўсе версіі «выдалі», але ж яно, мо, і зразумела: конкурс ёсць конкурс, друкуецца — толькі самае-самае. І ўжо зараз вам, чытачам, «журыць» — вызначаць, у каго атрымалася лепш.

Што датычыцца папярэдняга здымка (ён, нагадаем, на базары быў зроблены. Мужчынка там сам сябе ўзважваў), то лепшымі подпісамі да яго вялікае чытацкае журы палічыла радкі Юрыя Вінаградава з Бабруйска, Люцыі Богдан з в. Манькаўшчына Валожынскага раёна, Валерыя Гаўрыша з в. Навасёлкі Пастаўскага, Міхаіла Дубовіка з в. Арэшкавічы Бярэзінскага... І Любові Чыгрынавай... З чым ахвотна пагадзілася журы рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сярцам «Звязду» накіроўваецца ў вёску Забалацце Вілейскага раёна.

Хочаце атрымаць яго і вы, — калі ласка! Новы здымак прапануецца. Сілы паспрабаваць можна. Поспехаў!

Валянціна ДОЎНАР.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзённік Вікі Ц.

Я нават не ведаю, які зараз час. Здаецца, палова на другую. Свядомасць раствараецца ў гарачай каве, якую ўжо нават не ўспрымаеш як энергетык. «Глядзі, вунь пайшоў N.», — штурхае локцем у бок знаёмая (лічыцца, што мне як навічку ўсё павінна быць цікава). N.? Пайшоў? Куды пайшоў? Па калідору, як Шчырліц? Ды пайшоў ён, той N.! Увагу магчыма засяродзіць толькі на адной рэчы, а тут усяго і ўсіх занадта многа...

13.07.2007

Думаць музыку

У мяне музыкальны слых. Так даўно-даўно сказаў выкладчык па акардэону. І я на ўсякі выпадак паверыла. А з цягам часу пераканалася. І цяпер атаясамліваю розныя праявы жыцця з рознай музыкай. А калі ўся атмасфера навокал прапітаная музыкай, кожны робіцца неад'емнай яе часткай.

Хтосьці арыентуецца ў гэтым свеце па колеры, хтосьці — па паху, а я за гэты тыдзень ператварылася ў адно суцэльнае вуха і ўспрымаю свет на слых.

Начныя вуліцы звіняць прыпевам з песні Алега Міцяева: «Лета — гэта маленькае жыццё». У Горадзе майстроў пяюць званамі майстар-класы кавалёў. Прыходзіць на свой «Зорны час» (гэта такая вялікая прэс-канферэнцыя аднаго чалавека) Патрысія Каас, і паветра само спявае. Зразумела, блюз. За Ірынай Дарафеевай цягнецца шлейф фальклору з лёгкімі нотамі сучасных аранжыровак. Валерый Лявонцьеў — выдатнай загартоўкі дыска. Маладыя выканаўцы, усе разам, гучаць як аркестр Фінберга на рэпетыцыі.

Аўтамат для прыгатавання кавы шыпіць — так можа шыпець разбуджаны незадаволены кот. Дзяўчаты з глянцавых выданняў і гламурных тэлеканалаў скачуць на шпільках па лесвіцах фестывальнай дырэкцыі, быццам лёгкая кавалерыя — цок-цок-цок, цок-цок-цок, у сярэднім за дзень разоў па 10 туды і назад. Прэс-канферэнцыі агучваюцца рознагалосымі мелодыямі мабільнікаў, якія, нягледзячы на строгія папярэджанні вядучых, некаторыя ўсё адно забываюцца адключаць. Стыхійная выстава-продаж вулічных мастакоў разбаўленая дадатковымі ноткамі — выступленнямі на адкрытым паветры то этна-гуртоў, то маладых танцораў брэйк-данса. Прамыя ўключэнні тэлевізійнікаў непадалёк ад прэс-цэнтра нагадваюць бясконцую рэп-чытанку з рэфрэнам «Славянскі базар». Нецярпліва гудуць аўтамабілі — іх спыняюць на карысць пешаходаў строгія ДАІшнікі — падобна на распеўку-экспромт джазістаў.

У экстрэмальных умовах арганізм выкідвае фартэлі: а трэцяй — ночы? раніцы? — засынае пад Кіркорава (не-а, ён не прыехаў у Віцебск, гэта лепшыя канцэрты мінулых гадоў транслююцца на плошчы на вялізным экране), а потым прачынаецца роўна ў восем, за некалькі хвілін да будзільніка. Пад жвавую песню Андрэя Кунца: «На-араджаецца но-овы дзень...». Прычым яна нідзе не гучыць. Толькі ў маіх вушах. І ўсё гэта складваецца, сплятаецца ў нейкую агульную мелодыю...

Магчыма, праз нейкі, не вельмі працяглы, час душа стоміцца ад гэтай сімфоніі гукаў і запатрабуе абсалютнай, стэрыльнай цішыні. Але пакуль я думаю музыку. А яна, здаецца, не супраць. Калі-небудзь я напішу пра гэта. Магчыма, нават песню. Як напамін пра зусім іншы — фестывальны — лад жыцця.

Да чаго ўвесь гэты заблытаны, сумбурны запіс? Калі ў вас раптам выпадзе магчымасць трапіць у тое месца, дзе думаецца музыка — скарыстайце абавязкова. Не пашкадуеце. Быць можа, аднаго разу і хопіць: паглядзець, пабыць ды супакоіцца. А калі не — ласкава запрашаем у нашу суполку меламанаў. Думайце музыку, з ёй лягчэй жыць...

З жыцця кантрабандыстаў

ЗОЛАТА Ў... ЗВАРАЧНЫМ АПАРАЦЕ

Супрацоўнікі мытнага паста «Бераставіца» сумесна з работнікамі УКДБ па Гродзенскай вобласці спынілі спробу незаконнага ўвозу на тэрыторыю Беларусі буйной партыі залатых вырабаў.

Згодна з інфармацыяй прэс-групы Гродзенскай рэгіянальнай мытні, кантрабанда (больш за 600 вырабаў з золата агульнай вагой 2 кілаграмы 238 грамаў на суму, якая перавышае 95 мільёнаў рублёў) была выяўлена ў багажніку легкавога аўтамабіля. Выязджаючы з Польшчы, жыхар Магілёва схаваў золата... унутры зварачнага апарата, які быў ім набыты за мяжой.

Залатыя вырабы затрыманы па пратаколу аб адміністрацыйным правапарушэнні, матэрыялы справы перададзены ў суд для дачы прававой ацэнкі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.59	21.32	16.33
Віцебск —	4.41	21.28	16.47
Магілёў —	4.49	21.22	16.33
Гомель —	4.54	21.10	16.16
Гродна —	5.16	21.45	16.29
Брэст —	5.25	21.38	16.13

Месяц

Маладзік 14 ліпеня
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Аляксандры, Анастасіі, Вольгі, Марыі, Таццяны, Аляксея, Андрэя, Фёдара, Фядота, Яфіма;*
К. *Ядзвігі, Аляксея, Багдана, Марціна.*

Надвор'е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+32 — +34 °С	МАСКВА	+27 — +29 °С
ВІЛЬНЮС	+27 — +29 °С	РЫГА	+27 — +25 °С
КІЕЎ	+34 — +36 °С	С-ПЕЦЯРБУРГ	+23 — +25 °С

Усе: Без ападкаў

Дзве даты

17 ліпеня

1942 год — у гэты дзень пачалася Сталінградская бітва (працягвалася да 2 лютага 1943 г). У абарончых баях у раёне Сталінграда і ў самім горадзе войскі Сталінградскага, Паўднёва-Усходняга і Данскога франтоў гераічным супраціўленнем спынілі наступленне нямецка-фашысцкіх войскаў (6-й палявой і 4-й танкавай армій). Перамога ў Сталінградскай бітве мела для Савецкага Саюза вялізнае палітычнае, стратэгічнае і міжнароднае значэнне.

1938 год — амерыканскі авіямеханік Дуглас Карыган памылкова (з-за таго, што пераблытаў стрэлкі компаса) пераляцеў з Нью-Ёрка ў Дублін замест намечанага Лос-Анджэлеса. Гарады можна часам і пераблытаць, але як пераблытаць кантыненты?

Цытата дня:

«Улада над сабой — найвышэйшая ўлада, залежнасць ад сваіх страсцей — самае страшнае рабства».

Сенека.

Усміхнёмся!

Чарада варон украла групу «Бліскучыя».

☺

— Вовачка, ты чаму спазніўся на ўрок?
— У майго дзядулі здарыўся ўдар!
— Што, у яго хворае сэрца?
— Не, у бабулі занадта цяжкая патэльня!

☺

Даішнік спыняе джып, які ехаў са значным перавышэннем хуткасці, падыходзіць да яго, а адтуль з акна высоўваецца рука з соткай долараў. Даішнік збянтэжыўся і кажа:

— Хлопцы, праз пяць кіламетраў стаіць яшчэ патруль, не разганяйцеся...

З акна яшчэ сотка баксаў. Даішнік:

— А праз дзесць кіламетраў наша начальства...

З акна яшчэ сотка. Даішнік папраўляе кіцель, выцягваецца ў стужку, руку пад казырок:

— ВЕРШЫ!

☺

— У вас дзеці ёсць?
— Вам колькі?

Кредэкс Банк
ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

Ул. Некрасова, 114, 220040
г. Минск, Республика Беларусь
МФО 153001273, УНП 807000030, ОКПО 37560001
Тел. 287-83-19, факс 287-83-11
E-mail:mail@credexbank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 июля 2007 года

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2007 год	2006 год
1	2	3	4	5	6
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101	1	-	-
3	Средства в Национальном банке	1102	2	364,3	5,9
4	Ценные бумаги	1103		1 905,4	2 153,8
	для торговли	11031	3	-	-
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	1 905,4	2 153,8
	в наличии для продажи	11033	3.2	-	-
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	16 472,6	3 559,9
6	Кредиты клиентам	1106	5	-	-
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	-	-
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	151,0	3,3
9	Прочие активы	1109	8	52,0	21,0
10	ИТОГО активы	110		18 945,3	5 743,9
11	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
12	Средства Национального банка	1202	9	-	-
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	-	3 614,1
14	Средства клиентов	1206	11	1 998,4	102,7
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		-	-
16	Прочие обязательства	1209	12	7,2	14,0
17	ВСЕГО обязательства	120		2 005,6	3 730,8
18	КАПИТАЛ				
19	Уставный фонд	1211	12	14 201,4	1 440,6
20	Эмиссионный доход	1212		-	-
21	Резервный фонд	1213		488,7	360,2
22	Накопленная прибыль	1214	14	2 248,7	212,0
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	0,9	0,3
24	ВСЕГО капитал	121		16 939,7	2 013,1
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		18 945,3	5 743,9
26	ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ				
27	Требования	1301	16	39 242,3	2 034,9
28	Обязательства	1302	17	39 232,0	2 037,8

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ
на 1 июля 2007 года

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2007 год	2006 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		983,2	269,4
2	Процентные расходы	2012		2,0	116,2
3	Чистые процентные доходы	201	18	981,2	153,2
4	Комиссионные доходы	2021		378,4	0,7
5	Комиссионные расходы	2022		208,4	3,7
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	170,0	- 3,0
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	1 467,7	11,9
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	-	-
9	Доход в форме дивидендов	205		-	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	-	-
11	Прочие доходы	207	23	-	-
12	Операционные расходы	208	24	505,3	132,1
13	Прочие расходы	209	25	27,0	17,3
14	Налог на прибыль	210		338,0	0,9
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		1 748,6	11,8

Председатель Правления Т.И. Жевняк
Главный бухгалтер Т.Н. Дылько

Лицензия на осуществление банковских операций № 19 от 13.02.2007 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь

Кірмаш штотыднёвы рэкламны выпуск № 21 (553)
аддзел рэкламы 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Прадаецца

■ Пральная машына «Чайка» з ц/ф, б/к.
Тэл. 8-017-195-72-57.

■ «Форд-Фіеста» 1992 г.в., 1,1 Б, сіні, стан добры.
Тэл. 8-029-161-15-02.

■ Катэдж з усімі выгодамі каля р. Нёман, 40 км ад Ліды. 21 000 у.а., торг.
Тэл.: 8-029-889-95-10, 8-0156-17-62-88.

■ Тэрмінова! 2-пакаёвая кватэра Мінску. па вул. Асіпенкі-18, 4/5 корп. (42/23/6,5), с/в агульны, пакоі асобныя, балкон, тэл., лічыльнікі вады, сонечная, зялёны двор, добрыя суседзі, 83 000 у.а.
Тэл.: 8-017-233-33-40, 8-029-325-67-07.

■ Кватэра ў 2-кватэрным доме, які будуецца (з майстэрняй, пастаянная справа), сямейнаму без шкодных звычак у Брэсцкім р-не.
Тэл.: 8-029-801-69-81, 8-029-601-69-81.

■ Дом з гаспадарчымі пабудовамі, вялікі ўчастак зямлі, 3 км ад г. Мядзел.
Тэл. 8-017-973-81-70.

■ Акардэон «ROYAL-STANDARD», новы, поўны, 12 рэгістраў, вытворчасці Германія. Мадэль Montana.
Тэл. 8-029-298-94-26.

■ Будаўнічыя матэрыялы: цэгла, блокі перагародачныя, вагонка, брус і іншыя.
Тэл. 8-017-173-46-53.

■ Халадзільнік «Атлант» новы, тэлевізар «Віцязь» ч/б, новы.
Тэл. 8-029-378-15-36.

Куплю

■ Мотаблок у любым стане.
Тэл. 8-029-183-44-70.

■ «Аудзі»-80, -100 1986 г.в.; «Фольксваген» Гольф, Джэта, Пасат, В3.
Тэл. 8-029-114-50-29.

■ Старыя фотаапараты, аб'ектывы, часопіс «Советское фото» № 4 за 1969 г.
Тэл. 8-029-850-17-29.

■ Трактар Т-16, магчыма ў нерабочым стане.
Тэл. 8-029-553-05-63.

■ ГАЗ-САЗ-3307, БУС грузавы «Мерседэс»-407-409 у добрым стане.
Тэл.: 8-029-639-84-14, 8-029-204-47-36.

Рознае

■ Брыгада выконвае ўсе будаўнічыя работы, хутка і якасна. Матэрыял заказчыка.
Тэл. 8-029-761-87-25, увечары.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Тэлефон для даведак 287-17-79.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

Подпіс_____ Дата_____

ЗАПАСНЫЕ ЧАСТИ
• К КОМБАЙНАМ Дон-1500
• РЕМНИ
• ПОДШИПНИКИ
• ЦЕПИ ПРОВОДНЫЕ
• ОДНОРЯДНЫЕ, ДВУРЯДНЫЕ
• З/Ч К КАРТОФЕЛЕУБОРОЧНОЙ ТЕХНИКЕ.
тел. (017) 222-55-98
256-05-95, 222-59-06

РУПП «Мебельная фабрика «Восход» (Минский р-н, Осрошицкий Городок, ул. Ленина, 1) предоставляет в аренду помещения под офис и производство.
Тел. 507-21-80, факс 507-24-48.

Победители рекламной игры «ХРУСТИ В РИТМЕ!»

Поздравляем победителей рекламной игры «Хрусти в ритме!» (*призы — 20 MP-3 плееров и система домашнего кинотеатра Samsung*):

1. АНТУШЕВИЧ ЕВГЕНИЙ *г. Гомель*
2. БАБУНОВА СВЕТЛАНА *г. Гомель*
3. БУРЯК Д. П. *г. Гомель*
4. ДАНИЛЕНКО СВЕТЛАНА *г. Минск*
5. ДЕМЕНКОВА ИННА *Гомельская область*
6. ИГНАТЕНКО ТАТЬЯНА *г. Гомель*
7. КЛИШКИНА ЕЛЕНА *г. Гомель*
8. КОРОЛЕВА ИРИНА *г. Гомель*
9. КУЗЬМЕНКОВА ЕЛЕНА *г. Гомель*
10. ЛИТВИНОВ ИВАН *г. Могилев*
11. ЛУКЬЯНЕНКО ИРИНА *г. Гомель*
12. НИКОЛАЕНКО ГАЛИНА *г. Гомель*
13. ПЕТРОВ АЛЕКСАНДР *г. Гомель*
14. ПОВЕДЕНОК ГАЛИНА *г. Витебск*
15. РАЧКОВА АЛЕСЯ *г. Гомель*
16. РОДИОНОВА МАРИЯ *г. Гомель*
17. СОРОКА МАРГАРИТА *г. Гомель*
18. СТРОК ГАЛИНА *г. Минск*
19. ТАЛАН ВИТАЛИЙ *Гомельская обл.*
20. ТКАЧ НАТАЛЬЯ *г. Гомель*

Обладатель ***СИСТЕМЫ ДОМАШНЕГО КИНОТЕАТРА МАЛАХОВА Жанна*** *г. Гомель*

Благодарим всех участников рекламной игры!

Диплом № А 0453810 на имя **Самок М.Ю.**, регистрационный номер 02905, **считать недействительным.**

Считать недействительной квитанцию СООО «Белкоопстрах» **1-СУ серии ГС № 9250544 Шупан Л.М.,** факс 206-36-39.

ХАБАР У $3 ТЫС. СПРАБАВАЎ АТРЫМАЦЬ АДЗІН З НАМЕСНІКАЎ СТАРШЫНІ АРШАНСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

Адзін з намеснікаў старшыні Аршанскага райвыканкама затрыманы пры атрыманні хабару ад прадстаўніка камерцыйнай структуры.

Як паведамілі ў Віцебскай абласной пракуратуры, за спрыяльнае вырашэнне пытання аб вызначэнні пераможцы тэндарных таргоў па рэканструкцыі адной з установаў адукацыі чыноўнік хацеў атрымаць $3 тыс. У цяперашні час ён затрыманы. Супраць яго ўзбуджана крымінальная справа па ч. 3 арт. 430 Крымінальнага кодэкса Беларусі (атрыманне хабару асобай, якая займае адказную пасаду), у адпаведнасці з якой чыноўніку пагражае ад 8 да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Вольга ДАВЫДАВА, БЕЛТА.

У суд Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак ***Вашчылка Валерыя Вікенцьевіча***, 4 сакавіка 1974 года нараджэння, ураджэнца г. Баранавічы, апошняе месца жыхарства якога: г. Баранавічы, вул. Гаявая, 27-9. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра В.В. Вашчылка, паведаміць іх суду Баранавіцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.188. Індэкс 63850. Зак. № 3823. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12